КАЛОСЬСЕ

Літаратурна-навуковы часапіс

КНІЖКА 4 (13)

ВІЛЬНЯ 1937 ГОД

Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2

Складка на год—2 зал., на паўгода—1 зал.

Адна кніжка — 50 гр.

Заграніцу падвойная цана.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы

Зьмест кніжкі 4 (13) „Калосься“

Бел. Друкарня ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 4 (13) 1937 г. Год III

З паднятай галавой

прысьвячаю Моладзі

Кажуць: намалюй
ноч месячную, май,
альбо сівую буру на Ля-Маншы.
Ня быў я там, —
а знаю толькі жытніх песьняў край
і сьцежкі моладасьці нашай.

У даль яны ляглі,
ўсю зрэзалі зямлю,
то пылам засьціlaліся, то дымам, —
а ўсё-ж, як зачараваны, ня я адзін люблю
дарогі польныя Радзімы!

Нават восеньню, калі ў мурох сырых,
на цэгле мерзьлі песьняў адгалосы,
на дальніх,
на глыбокіх каляінах залатых
мы чулі топат, скрып калёсаў.

Сьмела!
ўзрокам сакаліным, браце, глянь! —
Прадуцца новых, ясных сьцежак ніткі.
Хто перашкодзе нам прабіць каменьня грань
і долю казачную выткаць?!

Хто там шэпча, баючыся скрыта, зноў
пачуўшы нашых крокаў адгалосы?
Маўчыце лепш!..
Пакіньце нас і спадчыну бацькоў!
За вамі не пайдзём ў Каносу!

Будзем чорнымі рукамі рваць спакой,
ў зару гадоў пылаючых ўглядацца!
Пайдзём праз хмары сінія з паднятай галавой
і скрышым іх
ў мазольных пальцах!

Час ужо сьцягом разгорнутым шумець,
над гарадамі, над бязьмежным полем!
Зрабіць жыцьцём — агонь,
і зьзяньнем—нават сьмерць,—
маланкай азарыўшай полюс!

Час ужо зямлю апаясаць зґрой,
рассеіць густа зоры па старонцы,
каб зазьвінелі берагі над Нёмнам і Дзьвіной
пад залатым
нарогам
сонца!

МАКСІМ ТАНК

Вільня, 16.X.37.

У аспэкце соцыяльнай справядлівасьці

(*Максім Танк* — **«Нарач»**, паэма. Вільня, 1937, бач. 100, 5×21).

Пад гэткім агульным загалоўкам бяруся збольшага схарактэрызаваць паэтыцкае творства аднаго з найвыдатнейшых сучасных беларускіх паэтаў Максіма Танка. Свае гэтыя аб ім увагі апіраю на паэме „Нарач“, як — памоему — тыповай для ўсяго дасюлешняга яго творства. Галоўнай характэрнай рыскай Танкавай паэзіі ёсьць соцыяльныя ідэалы. У многаструннай, багатай і мілагучнай ліры паэта тон аб народнай крыўдзе — у самым шырокім грамадзкім разуменьні — зьвініць найбольш звонка і зьяўляецца „*leitmotywam*“ Танкавых песьняў. Бачым гэта ў „Нарачы“, бачым так-жа і ў многіх творах зьмешчаных у зборніку „Журавінавы цьвет“, што выйшаў з друку зараз пасьля „Нарачы“. Творы ў гэным зборніку: „У туманох вішнёвых“, „Ой, калышыцца вецер“, „На акопах“, „Напеў“, „Песьня Кулікоў“, „Прайдуць гады“, „Нашы дарогі“, „Сказ пра Вяля“, „Журавінавы цьвет“ і інш., як ня трэба лепш пацьвярджаюць маю тэзу.

Праўда, ёсьць крытыкі літаратуры, якія ўважаюць, што паэзія толькі тады ёсьць сапраўды паэзіяй, калі яна зьяўляецца адбіцьцём толькі красы і калі, як зусім чужых сабе, розных іншых ідэалаў не дапускае і імі не займаецца. Крытыкі гэткага кірунку лічаць, што паэт да свайго творства павінен падходзіць вылучна з гледзішча фармальнага і з гэткага гледзішча крытык твор паэтыцкі павінен разважаць і крытыкаваць. З такім аднак паглядам фармалістаў згадзіцца немагчыма, як агулам няможна згадзіцца з усякім аднабокім кірункам чалавечай думкі. „*Veritas in medio*“, праўда пасярэдзіне. І гэта заўсёды і ўсюды, дык так і ў нашай справе; відаць гэта з сутнасьці паэзіі.

Паэзія, агулам гаворачы, гэта духовае творства чалавека, творства ў абразох, маляваных словам; паэзія — гэта выяўленьне ў прыгожай форме духовага сьвету паэта, выяўленьне ўсяго таго, што паэта хвалюе, чым ён жыве ў душы сваей, да чаго ён імкнецца. Паэтычны твор — гэта абраз і выяўленьне жыцьця, жыцьця зьверхняга і ўнутранага. Паэзія, кажа Гетэ, стараецца раскрыць тайны прыроды ў абразох.*) Знача, прадметам паэзіі зьяўляецца бадай усё тое, што ёсьць прадметам і іншага роду духовага творства чалавека, а ўжо форма, якой імя краса, прадмет гэны выдзяляе, прысабечвае і робіць з яго галіну паэзіі. Такім чынам зьмест і форма, форма й зьмест — гэта дзьве складовыя, істотныя часьціны паэзіі. Дзеля гэтага паэзіі ня можа быць чужой справа яе адносінаў да жыцьцёвых тайнаў: да праблемаў праўды лёгічнай, праўды этычнай, да праблемаў праўды

*) „Poesie deutet auf die Geheimnisse der Natur und sucht sie durchs Bild zu lösen“ (Goethe — Schriften zur Naturwissenschaft 1. Maximen und Reflexionen).

соцыяльнай і інш, як няможа быць чужой паэзіі справа яе адносінаў да формы, да праблемы красы зьверхняй і ўнутранай, духовай. Гэтыя дзьве рэчы ў паэзіі разьдзелены быць ня могуць, бо яны складаюць адно цэлае. І чым глыбейшы зьмест думкі паэта, і чым прыгажэйшая форма яго паэзіі, і чым глыбейшае і прыгажэйшае адчуваньне паэта,—тым страйнейшая, тым праўдзівейшая яго паэзія. У паэзіі выходзіць тое самае, што агулам у жыцьці чалавека, у якога „*mens sana in corpore sano*". Паэзія ў „*поўнакроўі*" зьместу і формы, у поўным зьліцьці ў вадно цэлае, непадзельнае, самастойнае. І паэт можа і павінен закранаць усякія праблемы духовага жыцьця чалавека, але павінен рабіць гэта *паэтычна*. Праўдзівая паэзія ня можа мець практычных мэтаў: этычнай, палітычнай, соцыяльнай ні якой іншай. Праўдзівая паэзія ня можа займацца агітацыяй, прапагандай чаго практычнага, канкрэтнага, бо яна тады выходзіць за рамкі эстэтыкі і перастае быць паэзіяй. Усякая праблема духа чалавека, а нават і праблемы практычнага, актуальнага характару могуць быць матарыялам для паэта, але іменна матарыялам: паэт іх павінен такператварыць, каб з іх гэнай актуальнасьці не асталося і званьня, але каб чалавека яны парывалі і захоплівалі, дзякуючы тэй красе і тым унутраным чарам, якія ім надаў паэт.

Добрую абарону паэзіі, якой асновай ёсьць актуальныя праблемы жыцьця, дае нам украінскі паэт Франко ў паэтычным сваім лісьце да паэта Воронога.

Вороный жадае ад паэта:

Пісень давайте нам поети,
Без тенденційноі прикмети,
Без соціяльного змаганьня,
Без усесвітнього страждання,
Без нарікання над юрбою,
Без гучних покликів до бою. —
Пісень свобідних і безпечних,
Добутих із глибин сердечних,
Де б той сучасник горем битий
Душею хвильну міг спочити.

На гэта адказвае Франко:

Ні, друже мій, не та година!
Сучасна пісьня — не перина,
Не госпітальнее лежання.
Вона вся пристрасть і бажання,
І вся вогонь і вся тривога,
Вся боротьба і вся дорога,
Шукання, дослід і погоні
До мет, що мчать по небосклоні.
Не думай, як поет покине
Загальних питань море сине,
І в тихий залив свого серця
Порине, — мов нурец забеться,
Що там він перли і алмази
Знайде блискучії, без скази,
Знайде тепло і розкіш раю
І світло й пахощі без краю. —

Ах, друже мій, поет сучасний —
Він тим сучасний, що нещасний.
Поет — значить: вродився хорим,
Болить чужим і власним горем,
В нього чутливість сильна, дика,
Еольська гарфа мов велика,
Що все бренить і не втихае:
В ній кождий стрічний вітер грае.

Так не жадайже, друже милий,
Щоб нас поети млою крили,
Рожевим пестощів туманом.
Містичних візій океаном,
Щоб опій нам давали в страви, —
Щоб нам співали для забави. —
Слова полова,
Але вогонь в одежі слова —
Безсмертна, чудотворна Фея,
Правдива іскра Прометея.*)

І вось-жа на маю думку М. Танк, які твора прадусім у аспэкце соцыяльных ідэалаў, які соцыяльныя беларускія злыбяды, а знача праблемы актуальныя, практычнага характару, нязвычайна жыва адчувае і якія зьяўляюцца найсільнейшым матывам яго ліры, — твора аднак паэтычна, твора так, як пясьняр чыстай красы. Але да гэтага яшчэ вернемся.

* * *

Максім Танк (Аўгень Скурка) радзіўся ў 1912 г. ў верасьні ў в. Пількаўшчына, Пастаўскага пав., недалёка ад возера Нарач, у беларускай сялянскай сям'і. Калі ён меў толькі два гады, бацьку яго забралі на вайну. Малы Танк астаўся з маткай. Калі ў 1915 г. нахлынула вайна на наш край, маці разам з будучым паэтам пакінула родны кут і выехала ў Расею. Падарозе ў Дзьвінску наступіла спатканьне з бацькам-жаўнерам, што ў Танка крыху захавалася ў памяці. Урэшце маці з сынам сваім апынулася аж у Маскве, дзе й прабыла аж да павароту на бацькаўшчыну. У Маскве маці песьняра зарабляла на пражыцьцё, працуючы сьпярша ў сьвяшчэньніка, пасьля ў палкоўніка, а пасьля на фабрыцы. Паварот дамоў наступіў у 1922 г., калі Танку было ўсяго яшчэ 10 гадоў.

Вучыўся М. Танк сьпярша ў пачаткавай школе ў Маскве, пасьля ў такой-жа школе польскай на бацькаўшчыне, у суседняй вёсцы, тады ў расейскай гімназіі ў Вялейцы; у 1928 г. ў Беларускай Гімназіі ў Радашкавічах і ў 1929 г. у Беларускай Гімназіі ў Вільні і ўрэшце ў тэй-жа Вільні ў расейскай гімназіі. Скончыць аднак гімназіі Танку не ўдалося — зацікаўленьне беларускім грамадзкім жыцьцём давяло яго да арышту і вастрогу ў 1932 г.

---

*) П. Лушпинський — Естетична аналіза поетичних творів, Львів, 1933, бач. 14.

Веду сваю М. Танк дапаўняў і дапаўняе далей прыватнымі студыямі, вытрывалай самаадукацыяй.

Сяньня Танк яшчэ зусім малады чалавек — яму толькі 25 гадоў. З натуры здольны, працавіты, сыстэматычны, вытрывалы. Беларуская паэзія і літаратура агулам захапіла яго ўсеўладна, ей пасьвячае ён усе свае маладыя сілы. Пісаў і піша далей Танк дужа многа. Шмат яго вершаў асталося пры судовых справах, шмат у вастрожных таварышаў, шмат ужо выйшла друкам, а шмат чакае на тую шчасьлівую хвіліну, калі зможа пясьняр іх выдаць і пусьціць у сьвет.

М. Танк пачаў пісаць у 1928 г. у Радашкаўскай Гімназіі. Друкавацца пачаў у „Часапісе для ўсіх", які выходзіў у Вільні і які па першым нумары быў спынены. Пасьля гэтага друкаваў ён свае вершы ў некаторых іншых часапісах, якіх спаткаў лёс успомненага. Сьпярша М. Танк пісаў свае вершы, як-бы на пробу, ня верачы ў свае сілы. І толькі ў 1935 г. узяўся ён за беларускую паэзію сур'ёзна, чуючы ў сабе талент і творчы поклік. Год гэты зьяўляецца годам пераломным, рашучым у яго творстве. У гэтым годзе паэт наш бліжэй падыйшоў да жыцьця сялян, з каторымі быў зьвязаны з малых дзён, а ад каторых была адарваўшы яго сусьветная вайна, бліжэй пазнаў іх быт, імкненьні, цяжкую барацьбу за штодзенны быт і барацьбу за іх правы, а так-жа глыбей адчуў красу наднарачанскай прыроды. Дзякуючы гэтаму зьбліжэньню, Танк захапіўся беларускай сялянскай стыхіяй пераважна ў яе соцыяльным аспэкце, на што галоўным чынам і наставіў сваю ліру.

Першы зборнік вершаў М. Танка зваўся *„На Этапах"*, што выйшаў друкам у 1936 г. На жаль, аднак, лёс гэтага зборніка быў сапраўды *„этапны"*, бо ён быў сканфіскаваны. У тым-жа годзе пасьля гэтага ў „Калосьсі" пачалася друкавацца паэма *„Нарач"*, якая летам сёлета пабачыла сьвет. Хутка за „Нарачай" так-жа сёлета паказаўся друкам зборнік вершаў *„Журавінавы цьвет"*. Дагэтуль цэнтральнае займае месца ў творстве М. Танка паэма „Нарач", як тыповы ўзор яго пісьменства, якой тут ніжэй гэтых некулькі ўваг і пасьвячаю.

* * *

Нагодай напісаць паэму „Нарач" паслужыла М. Танку наступнае праўдзівае здарэньне. У 1935 г. адміністрацыйныя ўлады воды возераў Нарач, Мястра і Батурына аддалі ў арэнду Дырэкцыі Дзяржаўных лясоў; сяляне, якія часта жывуць толькі з рыбалоўства і якія дагэтуль маглі гэтымі водамі карыстацца вольна, бяз ніякіх абмежаваньняў, спаткаліся з вялікімі абмежаваньнямі ў карыстаньні з вазёраў. Рыбалоўскую снасьць сяляне павінны былі аддаць пад кантролю ўладам. Факт гэты выклікаў вялікі перапалох і абурэньне ў сялян, якія былі гэтым дужа пакрыўджаны, а так-жа ў часткі польскага грамадзянства, якое ўважала

гэткую ўрадавую палітыку за шкодную інтарэсам дзяржавы. Справу пакрыўджаных сялян глыбока прыняў да сэрца й пясьняр М. Танк і задумаў паэму пад дужа трафным і характэрным назовам „Нарач“.

* * *

Вось галоўны зьмест паэмы „Нарач“ і яе фабулярная канва. У беднай хаце рыбака дачка яго Тацяна пляце сетку. Ужо позна, ноч. Бацька Сымон, стары рыбак, яшчэ на Нарачы ловіць рыбу. Урэшце прыходзіць — і прыводзіць з сабой гасьця. Госьць гэты — гэта нейкі незнаёмы ідэйны змагар за долю і права беларускага народу, які, дачуўшыся аб падзеях над Нарачай, прыходзіць туды, каб дапамагчы сялянам бараніцца. За гэткія справы быў ужо ён у вастрозе, а цяпер, кажа Тацяне:

„Іду ізноў старой дарогай,
іду — бы толькі не спачыць,
а зноў будзіць народ сярмяжны“...

Тацяна ўдумчывая сялянская дзяўчына. Яна бача навокал соцыяльную няроўнасьць і балюча гэта адчувае. Спатканьне Тацяны з незнаёмым ідэоўцам адчуцьцё гэта паглыбляе яшчэ больш і пакідае ў сэрцы глыбокі сьлед сымпатыі да яго. Яна бача ў памяці сваей „вочы незнаёмага“ і пытае:

„Дзе цяпер ён з тымі думамі шалёнымі?
Мо' завеенымі цягнецца дарогамі?“

На Тацяну заглядаецца багатага суседа сын Іван. Бацька гатоў аддаць яе. Яна не згаджаецца: у яе ў памяці „незнаёмы“, а не Іван — вораг сялянскай беднаты і правакатар. Іван падазрае, што Тацяна ужо некага мае сабе на воку і прыракае яму помсту.

Пакрыўджаныя рыбаловы нараджаюцца і на вечарынках моладзі і на сходах адумысловых. На адзін з такіх сходаў зьяўляецца ідэовец Грышка, які радзіць, як бараніцца ад бяды і крыўды. Грышка — гэта той самы незнаёмы. Цягне яго над Нарач і ў Сымонаву хату:

„Вось неспадзявана прыплёўся да вас,
да вашых арцеляў учора...
Відаць не апошні і гэты папас, —
штось цягне мяне да вазёраў...

Ад вас як я восеньню рана пайшоў,
абіў ўжо нямала парогаў, —
адно сваё шчасьце ў змаганьні знайшоў,
другое — спаткаў на дарогах.

Другім гэтым шчасьцем для Грышкі была Тацяна.

Да Грышкі на падмогу далучаецца Прахор. Ён дапамагае яму зьбіраць сход у сяле, ён верным таварышам яму і ў Мядзеле на кірмашы, дзе Грышка праводзе сярод сялян сваю працу, каб залажыць прафэсыянальны саюз.

Тацяна чакае павароту Грышкі з Мядзела над возерам. У дарозе, едучы лодкай, прызнаюцца абое, што яны ўзаемна палюбіліся.

Рыбакі стойка бароняць свайго права. Забурэньне ўзмагаецца. За Грышкам зорка сочаць. Іван ня дрэме — ён выдае Грышку і Прахора...

Заарыштаваныя, абодва з дарогі ўцякаюць. Прахора страж-нік цяжка раніць. Ня гледзячы на гэта, абодва йзноў прыходзяць над Нарач і цешацца яе відам.

Грышка:

„Глянь, там, там Нарач, як неба кавалак,
ляжыць абарваўшыся шырака сіне.
А далей, за берагавым пяшчаным валам,
Ляжыць вазёрная краіна!

Прахор:

„Хоць пад канец яшчэ убачу...
так, гэта Нарач"...

Змаганьне рыбаловаў за свае правы стойкае. Яны не ўступаюць і далей ловяць рыбу, як даўней лавілі. Дзеля гэтага па берагох Нарачы поўна вартаўнікоў, што ня пускаюць іх на возера. Грышка прабіраецца ў сяло, каб падтрымаць змаганьне і каб знайсьці каго дапамагчы яму падабраць раненага Прахора. Прахор тымчасам цяжка сумуе па сям'і:

„Нарач! Нарач! Нарач...
Родны бераг імглой заткала.
Там вербы, хата, сям'я"...

Ён адчувае штораз большы боль у грудзях і ў гарачцы зачынае маячыць — здаецца яму, што ён з арцеляй на рыбалоўстве, і няпрытомны ідзе глыбей у возера, на ягоныя хвалі і знаходзіць у іх сабе сьмерць.

Грышка прыходзіць да Сымона і ўзноў навязвае лучнасьць з рыбаловамі сялянамі. Тымчасам рыбаловы знаходзяць утопленіка-Прахора.

Грышка, спаткаўшыся з Тацянай, зьбіраецца ў дарогу. Грышку разважае Тацяна, каб ён быў асьцярожны, каб мо' адседзіў, а прынамся, каб хоць адпачыў. Урэшце разстаюцца. Цяжкое разстаньне. Але аблягчае яго ў абоіх вышэйшая любоў ад асабістай, любоў ідэі справядлівасьці.

Тымчасам роль павадырства сярод рыбаловаў бярэ Архіп і справа ня гіне, разьвіваецца, рыбаловы трымаюцца далей:

„Хай вецер сьмяецца і звоніць
медзьдзю шарахавак, звоніць па вёслах, як гром!
— мы вылавім сонца
ў паднебных прасторах і тонях! —

Топяцца сеткі ў жывое
азёр серабро"...

* * *

Але з гэтага сусім не вынікае, што М. Танк соцыяльныя ідэі праводзіць у сваім творстве коштам паэзіі. Сусім не. Ня відацца ў ім ані палітыка, ані соцыялёга, але толькі паэт. Здаецца, што і самыя скрайнія фармалісты ў гэтым сэнсе бадай нічога сутнага закінуць яму ня змогуць. Праўда, Танк тчэ сваю *„нарачанскую сетку“* на аснове цалком актуальных нарачанскіх соцыяльных злыбядаў, але патыкае іх вечнымі, што выходзяць за рамы часу і прастору, агульна-людзкімі ідэямі: красы, дабра і праўды, робячы гэту сваю работу выключна, як мастак, як паэт. Ніякіх практычных тэндэнцыяў ані моралізатарства ў „Нарачы“ Танка не спатыкаем, а спатыкаем там мілагучныя, вобразныя, сапраўды нарачанска-беларускія бытавыя малюнкі, якія самі сваей красой прыкоўваюць да сябе чытача і парушаюць душу яго да далёка выбягаючых за Нарач рэфлексіяў. „Нарач“ Танка, памойму, мусіць закрануць кожнага, нават і таго, хто праціўныя і варожыя героям „Нарачы“ мае соцыяльныя аспэкты. Здаецца, ня можна не спагадаць Тацяне, якая вяжучы сетку разважае аб сваей долі: долі дачкі беднага рыбака, долі батрачкі. Ня можна ня любіць ідэоўца Грышкі, які, закінуўшы сваё асабістае шчасьце, бродзіць па сьвеце і будзіць сярмяжны народ. Ня можа ня выклікаць глыбокага жалю трагічная сьмерць Прахора ў хвалях Нарачы. Ня можна не пачуць агіды да правакатара Івана і г. д.

А ўдзяляецца-ж чытачу паэзія Танка, нават у гэных сваіх мамэнтах соцыёлёгічных, іменна сама сабой, сваей праўдзівай жыцьцёвай красой, праўдай і сілай. Вось адзін з многіх прыкладаў:

„У людзей палосы доўгія, шырокія — разважае Тацяна —
І льны растуць густыя і высокія;
ткуць дзяўчаты з іх палотны і настольнікі,
расшываючы ды ў краскі, ў ясны зоранькі...
У мяне батрачкі зрэб‘е ды анучанькі
і ад працы, ад мазольнай, баляць ручанькі“...

Паэзія Танка ў яе соцыяльным аспэкце становіцца яшчэ магутнейшай і паўнейшай дзеля таго, што паэт соцыяльны быт і прыроду Нарача як-бы зьлівае ў вадзін абраз, які для яго большай вобразнасьці і выразнасьці падмалёўвае рознымі лірычнымі, часта глыбока-ідэолёгічнымі, рэфлексіямі.

Нарач і нарачанская злыбяда — гэта фактычна толькі зачэпка, нагода, з якой паэт дае *соцыяльны абраз агульна беларускі.* Нарач — гэта фрагмэнт, ці мо' лепш сымболь Беларусі ў яе соцыяльных імкненьнях, пасьля якіх прыйдзе новае жыцьцё:

„Прыйдзём яшчэ, вёска, твае песьняры,
ня з торбаю песьняў жабрачых:
бярозавым смыкам, на струнах зары,
з табой заіграем іначай“... —

кажа паэт у прадсьпеве.

Або ўзноў Грышка кажа Тацяне:

„Мо' сьцежкаю польнай
з шляхоў Беларусі
калі-небудзь...
да вас я вярнуся"...

як-бы гаворачы, што Нарач — гэта толькі фрагмэнт, ці лепш — абраз усей Беларусі.

Асабліва-ж ярка аб гэтым кажа паэт у эпілёгу:

„Ведаю, песьні, вам хочацца струнных разораў,
шолаху лесу зялёнага, шуму азёраў. —
сьніцца няраз вам шчасьлівая наша зямля.

Будзе ўсё гэта... Сталёвым нарогам падымем
новыя дні, залатых ураджаяў зару
зьбяром у снапы матораў рукамі стальнымі,
І вёснамі будзе цьвісьці маладымі,
вясёлкамі песьняў, мая Беларусь!.."

або:

„І заўтра на струнах — на новых дарогах
прыдзецца яшчэ апяваць Беларусь!.."

* * *

Зазначыўшы хоць дужа агульна аб галоўным матыве ліры Танка, хачу яшчэ зрабіць некалькі наступных уваг.

Вонкавая форма паэмы знаходзіцца на паважнай вышыні. І align розная ксьць тэхнікі вершаваньня, і паэтычнасьць, і чысьціня мовы, і лёгічны і празрысты падзел на 7 часьцей гэтага твору— усё разам рысуецца як з найлепшага боку.

Форме вонкавай цалком сумерна і гармонійна адпавядае форма ўнутраная. Гармонійнае і консэквэнтнае наступства падзеяў, дапасаваньне да характару зьместу адпаведнага віду вершаваньня, адпаведныя да гэтага-ж зьместу і асабістыя лірычныя рэфлексіі, а нават і адпаведныя да гэтага ўсяго сваім характарам высока паэтыцкія малюнкі прыроды і беларускага наднарачанскага быту — усё гэта разам гэтую так арыгінальную паэму „Нарач" робіць нечым суцэльна-аднолітым, поўным сапраўднага жыцьця, срога гармонійным і сымэтрычным, высока і магутна паэтычным. І гэта ўсё ў паэме знаходзіцца, ня гледзячы на тое, што ў многіх мясцох яна пааскубана, паабрывана праз увагу на цэнзуральныя варункі.

Для об'ектыўнасьці і для дабра самога паэта трэба адзначыць і некаторыя недахопы ці хоць-бы звычайныя пахібы яго. Маю ўражаньне, што ў Танка за слабыя, бледныя, нявыразныя, а часам і проста нейкія мляўкія выходзяць характары ягоных герояў. Асабліва гэта кідаецца ў вочы ў Тацяны. Праўда, яе высокая ідэовасьць і захопленьне справай соцыяльнай справядлівасьці зарысоўваецца выразна, але дужа мала гэта праяўляецца ў яе жыцьці і дзейнасьці, мала чуваць, што яна гэта глыбока перажывае, як мала чуваць, што яна цяжка перажывае і сваё расстаньне з Грышкам.

Нешта падобнае можна сказаць і аб некаторых іншых героях. Гэта знача, што Танк на псыхолёгічны бок у сваім эпіцкім творстве павінен зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Здаецца мне, што паэма „Нарач“ дужа надавалася-б на сцэнічную п'есу: на драму. Над гэтым паэту варта падумаць. Тут была-б нагода папрацаваць і над псыхолёгічным ажыўленьнем і ўзбагачаньнем яго герояў.

Высьцерагацца трэба ў паэзіі такіх „актуаліяў“, хоць дужа рэдкіх у Танка, як агітацыя залажыць „профсаюз“, як занадта вымоўнае выражэньне „а поп за хаўтуры загнуў. Бяз грошаў ня хоча маліцца“. Не хачу гэтым сказаць, што гэтых спраў у паэзіі ня можна парушаць. Не. Іх можна і трэба парушаць, але рабіць гэта трэба ня так „актуальна“, не вульгарна, а паэтычна. Бо-ж ведама, што і лыжкай дзёгцю можна сапсуць бочку мёду.

Мова Танка: жывая, паэтычная, стройная, сочная, але без патрэбы дапускае ён часта полёнізмы: нэндза, тлум; русыцызмы: алмаз, зара, а так-жа, здаецца, замнога ўжывае—хоць самых па сабе і харошых—нэолёгізмаў :мяцеліць,журавініць,крынічыць, перазвон.

На заканчэньне пару думак і ўваг. У паэме „Нарач“ Танк паказаўся, як дужа даравіты, арыгінальны, стыхійна-беларускі паэт, які нятолькі зручна і мастацка дае сабе раду хоць і ў вялікіх, але ўсё-ж агранічаных суб'ектывізмам паэтычных магчымасьцях лірычных, але выказаў вымоўна, што спраўляецца такжа і на шырокіх, проста бязмежных, шырэйшых як нарачанскага рыбака лодка, водах эпосу: эпічнага об'ектывізму.

На гэты раз эпос Танка выліўся прадусім у аспэкце соцыяльным. Таленту свайго паэт „у зямлю не закопвае“: разьвівае яго далей. Відаць гэта дужа выразна ў ягоных паэмках: *„Сказ пра Вяля“ і „Журавінавы цьвет“*, зьмешчаных у зборніку пад назовай гэтай-жа апошняй. Але талент Танка разьвіваецца і далей пераважна у аспэкце соцыяльных ідэяў. І далей Танк астаецца заварожаны соцыяльным эпосам. Добра гэта. Беларуская паэзія мае тут бяздонную крыніцу матарыялу для сябе. Але беларуская паэзія дагэтуль ня мае агульна-народнай, беларускай нацыянальнай эпопэі. Наколькі разумею духовую структуру ліры Танка і наколькі ацаняю яго паэтычныя здольнасьці і творчыя амбіцыі, — дык думаю, што „па Юрцы й шапка“ — Танк мог-бы спрабаваць сваіх сіл на фоне агульна-беларускага нацыянальнага эпосу. Але для гэтага трэба паэту шмат працы ў галіне беларускай гісторыі, а так-жа далейшай працы над самым сабой: над дысцыплінай і культурай свайго духа.

„І заўтра на струнах — на новых дарогах
прыдзецца яшчэ апяваць Беларусь!..“

Вось-жа не чакаць гэтых новых дарог, але на старых, сучасных дарогах трэба па новаму апяваць Беларусь, каб хутчэй Яна на гэных новых дарогах апынулася...

Ад. Станкевіч

На Новы Год

Глянеш — на родных прасторах вялікіх
шмат яшчэ дрэмлець іржавай тугі,
глуха на долю сярмяжную ў лыках
гонюць паўночныя ветры, сьнягі;

тонуць у гурбах людзкія сялібы,
дзе-недзе стрэхі чарнеюць адны,
тлеюць сьляпыя ваконныя шыбы —
доўга ня гаснуць лучыны агні...

Вучацца там — каб жывучае слова,
сілу яго векавую пазнаць,
каб на палосах нарогам сталёвым
выйшаўшы новыя вёсны падняць.

Не спатыкаць-жа Год Новы на печы!
Шмат яшчэ трэба здабыць перамог...
што нам варожаць бярозы аб нечым,—
на крыжаваньні далёкіх дарог?..

Ведаем самі!.. на нашых раўнінах
вырасьце колькі курганаў сівых...
Толькі каб Роднай Краіне ня кінуць
ў спадчыне—торбаў і песьняў глугіх!
8.IX.37 г.

* * *

Калі выкінула возера
трэскі чаўнакоў сасновыя, —
сьлёзы пырснулі каралямі
на рукавы паркалёвыя.

Сьлёзы — з вочаў цёплых, ласкавых,
словы — з вуснаў нецалованых —
загарэліся, як зоранькі,
ў пене чорнай усхвалёванай.

Хтось адважны тоні чорныя
ночкай асачыў глыбокаю,
пэрлы вылавіў дзявочыя
залацістай падвалокаю.

На палоў плывуць рыбацкія
лодкі сьмелыя і новыя.
Што-ж сыпнуць яны вярнуўшыся
на рукавы паркалёвыя?
2.VII.37

Лісьце каштанаў

За шэрым схіленым парканам
скрыпіць пясок сырых дарог,
спадае медны ліст каштанаў
на жоўты стоптаны мурог.

Ідзеш, яго рукамі лов'ш, —
злавіўшы — пусьціш, хай ляціць. —
Зноў ня шумець яму ў дуброве,
вясеньніх шолахаў ня піць.

І сумаваць яшчэ так рана,
калі ўдаль маніць сьцежак гладзь,
калі на шум лістоў ў тумане,
умееш песьняй адказаць;

калі так хочацца сьмяяцца,
што яшчэ чуеш, бачыш ты,
як ціха сыплецца праз пальцы
каштанаў звонкія лісты.

7.VIII.37.

Ў худых руках

Паслухайце, вясна ідзе.
Зьвініць ў маім акне жалеза.
З вінтоўкай стражнік ноч і дзень
пільнуе куст пахучы бэзу.

А ён расьцьвіў, агнём гарыць,
такім мяккім, пахучым, сінім;
на дрот калючы, на муры,
як хустку, полымя ускінуў.

Я ціха разбудзіў другіх...
Ад сьлёз сінелі вочы бэзам.
І недзе хруснула ў худых
руках іржавае жалеза.

28.VII.37.

Бярозе

За частаколам ціха што так
расой ты плачаш на пясок.
Мы прынясьлі вядро і лотак,
каб малады твой выпіць сок.

І можа ты за нашу радасьць,
як ляжам мы на струнах меж,
асыплеш жарам лістападу,
густым карэньнем апляцеш.

І возьмеш ўсё, што не аддалі,
ці мо' забыліся аддаць,
людзям, барознам, сіняй далі
і новым маладым гадам.
24.VII.37.

Дзед і шчупак

Было неба то сіняе, то ружовае —
а пад ім малая хатка рыбака...
І было, як неба, возера шырокае, —
шумела там заўсёды асака.
А ў глыбокай тоні
жыў Шчупак сярэбраны,
з вострымі зубамі, хітры, як купец.
Паляваў ня раз за ім стары дзед з сеткамі,
толькі дарма
муцячы
возерную медзь.
Часам ён засядзе за ракітай з вечара
і накрышыць зораў — залатых зярнят. —
Думае і цешыцца: на прыманку выплывеш,
зораў не паласаваць — ня ўцерпіш, брат!..
Ды памалу дрэме дзед стары над возерам.
А ў глыбокай тоні слухае Шчупак,
як над сонным берагам, ноччу заваражаны,
ціха барадаты захрапе рыбак.
Выплыве тады ён
серабрыста кружачы, —
ціха так, каб хваляў сонных ня збудзіць,
і з-пад сетак сініх, вуснамі сьцюдзёнымі
пачынае зоры дзедавы лавіць.
Перш ён зловіць Сіцца,
посьпе і Мядзьведзіцу,
вып'е сьцежку зорную вясьняных сноў,
выцягнець на'т з сетак абаранку месяца...
І зноў,
ціха кружачы,
ападзе на дно.
І як толькі сонца ў барадзе сівеючай
азалоціць белы серабрысты сьнег,
і як толькі вецер раніцай за пазухай

шчакаціць мяккімі пальцамі пачне, —
дзед прачнецца
спуджаны,
паглядзіць на возера:—
усе зоры выпіў — вылавіў Шчупак...
З гора замахае доўгімі рукамі,
быццам папярхнуўшыся мукой вятрак.
Ды пачне гразіць ён, ў сеткі ўблытаўшыся,
ідучы дарогаю праз сенажаць...
Дзесь гамоняць звонка кнігаўкі і чэпікі,
разсыпае вецер жвірам песьню жаб.
І здаецца дзеду, што сьмяецца возера,
ў сонцы расьцьвітаючы, як чырвоны мак, —
хіліцца, хахоча асака зялёная,
што яго, старога, ашукаў Шчупак.
13.VII.37.

Павязьлі цягнікі

Павязьлі цягнікі
восень з вёсак у горад
праз імглу, праз іржышчы, бары, —
каб з антонавак сонца і з стагоў памідораў
дагарала на шыбах вітрын.
І ніколі ня можна было ўдоваль напіцца,
таго сонца, сіротам малым,
з безрабочых кварталаў,
сівым камяніцам,
сутарэням глыбокім,
сырым...
Але можна было складаць песьні пра восень
і пра жоўтае лісьце дарожных бяроз, —
ў кожным слове шумела мільёны калосься
і зьвінела сталь вострая кос.
Толькі, гэткую песьню пачуўшы, вітрыны
раптам гасьлі,
трывожна крычалі гудкі...
ды ляцелі на вёскі, з новай весткай па шынах
ашалелыя
з грывай агня
цягнікі.
Іх на кожным паўстанку,
як ўраджайнае лета,
спатыкалі дзяўчаты і хмары касцоў,
і з усей Беларусі, скрыпачы і пээты, —
а іх больш
як, ў Краіне Маей, каласоў.
17.IX.37.

* * *

Ўздымаецца лісьце сярэбраным роем.
Абліў усё месяц марознай пагодай.
І песьня лунае начлежная воддаль
над полымем яркім калышучы мроі.
Эх, весела з рэхам асеньнім спаткацца!
і гулка адклікнуцца песьняй вясёлай, —
калі маеш вёсен адных толькі дваццаць
і ў сэрцы гарачы вёшнёвы іх золак. —
Тады нам шрамы на руках ад жалеза,
здаецца, маўчаць, анямелі, ня ныюць, —
скрыпяць толькі ціха гасьцінцы сівыя,
ды звоняць асотам паросшыя межы.
І сыпяцца зоры... Нат дзедаву шапку
набраў-бы іх пэўна кудлатую поўна
і то засталося-б мо' пару ахапкаў
для Нарачы шэрай, для сіняга Нёмну! —
Панёс-бы іх ціха, як хлеба зярняты,
па польных дарогах далёкіх і блізкіх,
каб толькі сьмяяліся дзеці ў калысках,
каб шыбы начамі гарэлі у хатах...
А лісьце ўздымаецца, кружыцца роем,
як сьнег каляровы калышыцца воддаль...
Мо' гэта ня лісьце... — крылатыя мроі,
аблітыя месячнай белай пагодай...

Пачатак оды

З сьцюдзёных красак белых, сініх
зусім сплятаць вянкі ня штука. —
Мець толькі трэба трохі спрыту,
без мазалёў мяккія рукі,
і трохі больш мякчэйшых скабаў,
і рыб'я хвост каб плыць за модай, —
тады балотны рохат жабы
ахрысьцяць нябывалай одай.
Хто ня чытаў з зліняўшых вуснаў
усякіх маляваных німфаў,
таго абвыюць па-сабаччу,
зусім бяз толку і бяз рыфмы.
А не схіліўся? — яшчэ лепей
сьвінны кароль ці туз фабрычны
ярлык на творчасьці налепіць
і над табой паставіць клічнік.
Тады пацягнуць цябе чэрці
і па жалезе і па сходах...
у іх „канцом“ гэта завецца,
а у мяне пачаткам оды.

МАКСІМ ТАНК

На пераломе

(Заўвагі да творчасьці Максіма Танка)

Канец трыццатых гадоў нашага сталецьця будучыя дасьледчыкі нацыянальных рухаў назавуць у Беларусаў канцом беларускага Адраджэньня. Першая ліквідацыя „нацдэмаўшчыны“ на Усходзе і „Грамады“ на Захадзе — вось гранічныя капцы закончанага пэрыяду. Адраджэньне культурна-гаспадарчае не магло зьмясьціцца ў недатарнаваных да сябе рамках, яно шукала выхаду ў палітычным афармленьні, але дзякуючы вонкавым прычынам і наяўнасьці цэнтрабежных сілаў афармленьня гэтага не знайшло. Гэтак закончыўся адрэзак навейшай беларускай гісторыі.

Эпігоны адраджэнізму*) ў заходне-беларускай літаратуры (тачней у паэзіі) не змаглі унікнуць у дух эпохі і таму не перастроілі сваіх лір, яны не змаглі знайсьці вех аддзяляючых адбыты пэрыяд гістарычнага разьвіцьця і... завісьлі неяк у паветры.

Перад імі паўстала пагроза стацца тыповымі прадстаўнікамі fin de siécle'ю.

У той час, калі з беларускай літаратуры на Усходзе сілком зрабілі рыкшу, на каторым раз'яжджае расейскі Чапаев, літаратура на Захадзе пачала таптацца на месцы ўзбагачаючы форму і шліфуючы дэталі. Паўстала паэзія зачараванага кола, каторую цягнулі песьняры ў ярме старых канонаў.

Потым — зарысаваўся сілуэт Максіма Танка.

Перад намі тры кнігі Максіма Танка. Першая—*„На этапах“*— ёсьць цалком уданым экспэрымэнтам перашагнуць праз традыцыйны адраджэнізм. У дасканалай прадмове да зборніку Р. Баравы называе кірунак творчасьці Танка бунтам зямлі.

Ён піша:

> „Гэты бунт, які падымаецца ад чорных скібаў, прыходзіць на замену таму пэрыяду, які адбівае ў сабе матывы народнага адраджэньня. Тады трэба было яшчэ даводзіць, што мы людзі, або хочам „людзьмі звацца“, там была скарґа, часта сьлёзы, трэба было расчуліць сьвет сваею нядоляю, трэба было перамагаць нявольніцкую псыхіку, якую ў спадчыну ад вякоў пакінула для нас праклятая паншчына. Цяпер у паэзіі іншыя думы, бадзёрыя настрої, бунтарныя песьні...“ —

У гэтай кнізе як і ў наступных Танк рашуча адвярнуўся ад адраджэнізму. Аўтар аніводным словам не ўспамінае аб адра-

---

*) Ужываю слова адраджэнізм у сэнсе літаратурнага кірунку роўналеглага да нацыянальнага Адраджэньня.

джэньні. — Ён зрабіў шаг наперад і замкнуў зборнікам літаратурны пэрыяд. Адначасна з нутраным пераваротам, творчасьць Танка была піонерскай у галіне вершаваньня. Паўстала новая форма — белы верш дагэтуль у нас чамусьці непрактыкаваны, выкуліся строфы нерымаваныя, але з „сваім“ ударным рытмам.

Наагул Танк ударны паэт пералому:

„Жыць нам прышлося вялікімі днямі,
на пераломе
жалеза і песьняў;
ў новых маланках, у новым громе
молатам выкутых песьняў“...

І амаль што ў цэлым зборніку „На этапах“, там, дзе пясьняр хоць на мінуту адыйшоў ад вастрожных візыяў і рэмінісцэнцыяў, часам побач і ў сувязі з імі раздаецца топат ног — гэта ў маршы праходзяць маладыя кагорты....

Ня ўсе ў бягучы мамэнт зразумелі творства паэта. Былі ўжо галасы „пратэсту“. Для вуха і нэрваў філістраў яно забунтарнае. Яны не даруюць Танку адсутнасьці ў ягоных творах проблематыкі адраджэньня і тых штурмуючых калоннаў санкюлотаў, што роўным крокам адбіваюць такт на цэлым абшары ягонае лірыка-эпікі.

Філістры ўжо забіралі голас і лапаталі аб Танку, што ён, бачыце, недастаткова патрыятычны, не распрацоўвае „нацыянальнай тэматыкі“ і выказывалі іншыя сэнтэнцыі, стоячыя большменш на ўзроўні літаратурных вымаганьняў баб з магля. З вуснаў гэтых-жа людзей чуліся скаргі, што ў нас прынята выхваляць кожнага аўтара. На наш пагляд, сталася гэта таму, што Максім Танк крыху выйшаў наперад, высунуўся з шэрэгу людзей свайго пакаленьня. Прыходзяць на думку словы Ніцшэ ў „Зьмяркапьні бажкоў (Götzen-Dänmerung): — Я напісаў для немцаў кнігі найглыбейшыя па зьместу з усіх, якія яны маюць, што ёсьць дастатковаю асновай, каб немцы аніводнага слова з іх не зразумелі —

Навязалі мы тутака да слоў Ніцшэ непрыпадкова: творчасьць Танка нельга паддаць уплывалёгічным дасьледзінам; яна моцная, ап'яняючая размахам і адначасна падскурная. І тут знаходзім некаторы стык з Ф. Ніцшэ. Ашаламляюча ўладарныя словы выступаюць у нашага песьняра ў падобнай ступені, як у творах вялікага немца. І чытаючы верш „П'яны баян“ мімавольна прысоўваецца да нас Заратустра са сваім: „Ich lehre euch den Übermenschen“ і часта паўтараным зваротам: — „Es ist die höchste Zeit!“. —

„Нарач“. Барацьба за вазёры. Мартыролёгія беларускіх рыбакоў. Багаты краявід. Цудоўныя пленэры. Каротка-мэтражны фільм ці хроніка Фокса. Гэта адзін бок.

З другога боку ўзлёты паэзіі стульна злучанай з акцыяй. Паэзія пераломy, пераломy „жалеза і песьняў."

Паэма „Нарач" у сямі частках мае эпілёг:

„За шыбамі тлеюць у попеле сінія зоры.
Мерзнуць ад сьцюжы апухшыя пальцы, баляць,
Ведаю песьні, вам хочацца струнных разораў, —
шолаху лесу зялённага, шуму азёраў, —
сьніцца няраз вам шчасьлівая наша зямля.

. . . .

— — — — — — — — — —

І ноч вось праходзе... За шыбамі вецер...
За сына дзесь моліцца матка цяпер...
А я хачу сонца засеяць па сьвеце
і ворагам кінуць у вочы з пад сэрца
апырскапы кроўю гарачаю верш!
Вось раніца ціха лягла на падлогу...
Хоць хлеба няма, але песьні бяру, —
разсеяць іх трэба па родных разлогах.
І заўтра на струнах — на новых дарогах
прыдзецца яшчэ апяваць Беларусь." —

Калі ёсьць эпілёг, дык трэба думаць, што твор зусім закончаны. Аднак, здаецца, што гэтак ня ёсьць—два разы варочаецца Грышка на Нарач, а потым у крытычным мамэнце ён счэзае. Чаму, — мы ведаем. Але далейшы лёс галоўнае дзеючай асобы нас вельмі цікавіць і непакоіць. Выясьненьня няма. Ці далейшая ягоная дарога можа быць у сучасны мамэнт выясьнена ці не? Палкае пытаньне! Ня нам уходзіць у інтэнцыю аўтара, але разгорнуты абраз патрабуе лёгічнага заканчэньня — не канешна амэрыканскага happy end'у — крыху сьвятла на пэрыпэтыі цэнтральнае фігуры.

Магчыма, што ў гэтай справе і гэтай плошчы разьвязаньняня знойдзем, мо' трэба яго пашукаць у трэцяй кніжцы Танка— *„Журавінавы цьвет"?* Мо' „там, дзе паспрачаліся тры дарогі: адна з вёскі, другая з князевага двору, а трэцяя з сьвету шырокага, вольнага; там, дзе з працы йдучы па сярэдняй трапе, людзі вострыя косы нясьлі, гаварылі"?...

„Сказ пра Вяля" (народная быліна) пераносіць нас з Нарачы на іншы грунт і намагаецца адцягнуць нашую ўвагу ад адкрытага пытаньня.

Да народных былінаў трэба падыходзіць надта асьцярожна; гэта пераважна род твораў у грамадзкім значэньні безадказны.

Мала таго, да народных былінаў можна мець нават пэўнае упярэджаньне. Яны неяк здэградаваліся. У часы савецкага нэпу выйшла друкам быліна расейскага клясыка Дем'яна Беднага аб „Тресте Синдикатовиче." Вось фрагмэнцік:

— А подитко ты Трест Синдикатович,
Со своею дружиной хороброю
Со своей головою коммерческой
Да со всею своею словестностью
К растакой распроэтакой матери.—

Таленавіта, толькі зашмат стылізавана пад народнасьць. У Танка ў „Сказе пра Вяля“ мала стылізацыі, затое дамінуе грамадзкі элемэнт. Вяль — гэта Грышка з „Нарачы,“ толькі меней рэторычны; ён ня мае ў сабе рэзонэрства, адзінка моцная (волат) і актыўная. І здаецца, што гэнэзы „Сказу пра Вяля“ трэба шукаць у незакончанасьці „Нарачы.“ Што да апанаваньня сродкаў мастацкага уздзейнічаньня, дык у гэтай быліне Танк паказаў сябе сапраўдным майстрам інструмэнтацыі.

— А як выйшаў Вяль з чачоткавай дубінай,
замахнуўся, — быццам тысяча вятроў! —
а ударыў — сьледам пасеку пакінуў,
ці граду галоў — расьцьвіўшых качаноў!
Як зайгралі
косы юрачку стальныя,
ўзьнялі коні капытамі крыжачок,
як лявоніха пад сосны баравыя
лапцем шэрым
узьмяцеліла пясок!
Адступаць пачала князева дружына,
ўдаль вячэрнюю палёў, назад,
быццам поясам
парваным, жураўліным,
быццам стада
разагнаных
курапат... —

Максім Танк першы з заходне-беларускіх песьняроў замацаваў і сконстатаваў у мастацкім уяўленьні канец беларускага Адраджэньня. Знаходзімся на наступным этапе, яшчэ не па рамантычнай прадвесьні эпігонаў адраджэнізму, а толькі на пераломе жалеза і песьняў. Што да „прадвесьняў,“ дык — параўноўваючы да іншых сучасных нашых паэтаў—Танк ня надта шчодры — прадвесьнямі не раськідваецца. Наадварот: — ...агонь запалілі мы поўначчу чорнай...
— Ягоная муза далёкая ад рамантыкі: —

Рэж нарогам дзірван!
Вытры сталь волі з іржы!
З моладзьдзю поплеч стань,
хто хоча заўтра жыць!

Які пэрыяд папераджае прадвесьне, пясьняр не гавора. Ён толькі пясьняр і з крытэрыямі рацыяналізму падыходзіць да вытвараў натхненьня абсолютнага права ня маем. Але зарызыкуем адхіліць край паэтыцкае завесы, зазлянуць углыб і прачытаць на экране аўтаравай інтуіцыі назоў пары наступіўшай пасьля Адраджэньня.

Яна, здаецца, будзе звацца — парой македонскай...

А. Бужанскі

З асеньніх настрояў

Дзень асеньні ўстаў панад нівамі,
працірпаючы вочы сьлязьлівыя,
йржавай рызай лісьця і анучамі,
брудна-шэрых туманаў акручаны.

Ўстаў, зірнуў, пазяхнуў... Ўзварухнулася
груганоў грамада між асінамі,
чорнай сажай крыльля разгарнулася,
зашумела, ўзьнялась над галінамі,

й паплыла у палі, цяжка змучана,
ймглой рудою, як сеткаю, злучана...

А разбуджаны дзень панад нівамі
расплескаўся дажджамі краплівымі,
мокрым ветрам раз'енчыўся нечага,
растапіўся у жалях да вечара...

Асеньняя элегія

Дзень устаў яснай цішай
над сьцішаным полем асеньнім,
усьміхнуўся пажоўклым асінам
праз сіні, астыўшы туман,
растапіў асьцярожна
ў баразнах залёгшыя цені, —
і тады... зашумеў у лазе
балазе загуляўшы цыган.
Закруцілася вірам-забавай
іржавае лісьце ігрушаў,
загула многаструнна
над руняй іглястай імгла.
Усё ён — дзень—у палёх раськідаў,
перабраў, разварушыў
пахам восенным моцным,
урочным упіўся, відаць,
на пажоўклыя дрэвы
з напевам хрыплівым зваліўся,
пакрышыў, пазагачыў
дзіцячыя пальцы сукоў.
А пасьля...—уздыхнуў і уміг
пераціх, засмуціўся,
лёг на ўзмежку нязручна
ў анучах зрудзелых лістоў.
Так і ў нас пераціхнуць калісьці,
як лісьці, парывы, змаганьні

прамінуць усе праўды,
сапраўды парвуцца, як ніць, —
азірнёмся назад, на змысьлёныя цені,
хаценьні, жаданьні...—
ляжам з восеняй сьлёзнай
ў барозне сьлізкой адпачыць...

НАТАЛЬЛЯ АРСЕНЬНЕВА

Ліпнёвы дзень

Паўдзённы сьпёк, над возерам калышыць
крыштальны дах расплаўленага дня.
Ў вадзе узор ня можыць сонца вышыць
ніяк, —
чуць-чуць хвалюецца вада.

Заснуў чарот...
ня бродзіць ціхі шолах,
маўчыць трысьцё, сіта і асака.
Як да дзяцей —
да белых лілі кволых
сама з пяшчотай цягнецца рука.

Ліпнёвы дзень...
На ўзгорках пазалотай
хвалююць сэрца жыта і аўсы,
маўчыць ў душы трывога і клапоты,
ў душы спакой —
ліпнёвае красы.

Пад чоўнам сіні блеск вады цьвітучай
на вёслах звоніць капель ціхі плёск,
крынічуць словы нейкі хмель пявучы,
і бродзяць думы —
ліпкія, як воск.

Вісяты 2.VII.37.

Ліпень

Зьвіняць над ліпай пчолы
і пахне сьвежы мёд,
ў калосьсі сьпелым шолах
заводзіць карагод.

Касцы ў лугох пачалі
сталёвы перазвон.
Сіней за сінь паркалю
цьвіціць курчавы лён.

Ідуць да жыта жнеі,—
пяюць пра паласу;
запомнілі, што елі
бяз хлеба ўжо вясну.

А дзень такі гарачы, —
крышталіць сонца даль, —
сьпяваюць песьню працы —
жняя, касец і сталь.

Дзіцячая улада
над вёскаю усей, —
гарох, бабоў і саду
вартуй сусед пільней.

Зьвіняць над ліпай пчолы
і пахне сьвежы мёд, —
брыдзе па вёсках-сёлах
ліпнёвых дзён паход.

Вісяты 18.VII.37.

* * *

Па палудню — звыклым буднем,
не чакаў нат' на бяду,
а спаткаў цябе ля студні,
як ты чэрпала ваду.

Вочы зорамі сьвяцілі,
па плячы каса паўзла
і страйней белай ліліі
ты уся сама была.

Штось гуторылі пра жніва,
пра ячмень і пра аўсы,
а за плотам сьветлым дзівам
пеніў вецер каласы.

І пілі з вядра вадзіцу
і п'янелі ад вады, —
гэтак часам сон сасьніцца, —
сьветлы сон і малады.

Ці бяз згоды, ці за згодай, —
я ня знаю аж дасюль, —
сонца яркай пазалотай
заліло цябе усю.

Расталіся у задуме
без пяшчот і цёплых слоў,
толькі вочы ціхім сумам
правялі цябе дамоў.

І ні слова пра каханьне
не сказалі мы тады.
І ня зналі, што спатканьне
прынясе нам шмат бяды.
Вісяты 5.VIII.37

Лета

Лета—жанчынай у хустцы шаўковай —
ліпень гарачы вядзе па зямлі.
Хаты у зелень хаваюць галсвы,
золатам сьпелым хвалююць палі.

Цягнуцца з сенам вазы па дарозе,
з пылам танцуюць за імі вятры,
моліцца конік, на ўзьмежку, — пагодзе;
воструць сялянкі у кузьні сярпы.

Голыя дзеці у сонцы гарачым,
звонка крынічыцца сьмех над ракой, —
лета вядзе, перагудам зьвінячым,
сьветлыя дзівы жыцьця за сабой.

Хутка і пільніца прыдзе у вёску, —
косы з чырвонай зарой зазьвіняць,
стануць у россып касцы на палосках,—
рушыць да бою працоўная раць.

Жніво

Высахлі каплі расы на узьмежках,
з неба ласкавае сонца глядзіць, —
сьцелецца шоўкам трыпутнік па сьцежках,
жніва выходзіць прасторам званіць.

Белымі птушкамі ў жыце галовы...
Шастуюць жмені уздоўж паласы...
Вецер па межах гуляе у схoвы, —
гнуцца і ціха шумяць каласы.

Глянуў іржэўнік...
і струны — разоры...
Роўна кладуцца на гранку снапы,
Сам разьвярнуўся настольнік узорны, —
новы узор нашываюць сярпы.

Ўюцца вускія палосы далёка,
беліцца жоўтая гладзь каласоў.
Працай расквечана, полем шырокім
лета праходзіць, як песьня бяз слоў.
Вісяты, жнівень 1937 г.

Начная калыханка

Ноч гуторыць шопатам
з лісьцем і травой:
—ўсе людзкія клопаты
патушу з зарой.

Над палямі соннымі
распушчу крыльлё,
буду снамі ўзорнымі
калыхаць жыцьцё.

Стану над вазёрамі,
дзе шуміць сіта —
загарыцца зорамі
цёмная вада.

На гальлю бярозавым
косы распушчу
і абсыплю росамі
сонную зямлю.

Пабрыду дарогамі
між лагчын і гор,
ціхаю зьнямогаю
абніму прастор.

Хай крычаць жабрачыя
совы у гаю, —
я над вёскай сьпячаю —
вартаю стаю.

Таболы 15.IX.37 *МІХАСЬ МАШАРА*

Праблема сфармаваньня нацыянальнае душы Максіма Багдановіча

(Да дваццатых угодкаў сьмерці паэта)

25-га траўня с. г. мінула дваццаць гадоў ад дня перадчаснае сьмерці Максіма Багдановіча. Каб адзначыць гэтыя сумныя ўгодкі, Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы зладзіла ў аднэй із саляў Віленскага Унівэрсытэту ўрачыстае паседжаньне, на якім беларускі літаратурны крытык Антон Навіна прачытаў абшырны даклад аб жыцьці і творчасьці вялікага паэта.

Пераказваем тут з магчымай точнасьцяй галоўныя думкі тэй часткі рэфэрату, у якой дакладчык даў разьвязку праблемы: як гэта сталася, што Багдановіч — далёка ад роднага краю, сярод чужога нацыянальнага асяродзьдзя, ня гледзячы на магутны ўплыў гэткае багатае расейскае культуры, — захаваў сваю нацыянальную душу, вырас на сьведамага Беларуса і—больш таго — стаўся беларускім нацыянальным песьняром.

— Сярод цэлае чаргі нашых паэтаў і пісьменьнікаў, пераважна сыноў беларускае працоўнае вёскі і болей або меней актыўных барацьбітоў за беларускую справу, якія к мамэнту выступленьня Багдановіча на паэтыцкай ніве мелі ўжо слаўнае імя, ён стаіць неяк асабняком: ён іншы ад іх, да нікога не падобны, ад усіх роўна далёкі. Ён ня мае магутнае сілы, выбуховасьці, дынамізму вершаў Купалы, не дае шырокіх, сакавітых малюнкаў Коласа: Багдановіч ціха пяе свае маленькія, але заўсёды вялікае мастацкае вартасьці кантыленкі, якія сам некалі прыраўнаваў да статуэтак ведамага італіянскага скульптара — Чэльліні. І творчасьці яго нельга ставіць у адзін рад з творчасьцяй іншых беларускіх паэтаў: непараўнальнага нельга ні з кім раўнаваць. Аб ім трэба гаварыць, як аб *нязвычайным у нашай паэзіі фэномэне*.

Каб разгадаць Багдановічаву творчасьць, каб зразумець, як мог гэты фэномэн зьявіцца ў беларускім культурным жыцьці, трэба перадусім бліжэй пазнаёміцца з асобай паэта, з тым асяродзьдзем, у якім ён нарадзіўся і вырас, з тымі культурнымі і ідэолёгічнымі ўплывамі, якія выраблялі ягоную душу.

Пачнём з нудных звычайна, але неабходных інфармацыяў,— з „біографічнага пратаколу“ Максіма Багдановіча.

Нарадзіўся Максім Багдановіч у Менску—у 1891 годзе (паводле старога стылю — 27 лістапада), у сям'і вонкава — бо па мове—абмаскоўленага беларускага інтэлігента, выхаджэнца з беларускае вёскі, Адама Багдановіча. Зусім малым дзіцянём перабраўся з бацькамі ў Горадню, дзе Адам Багдановіч меў працу і жыў ад 1892 да 1896 году. У 1896 годзе памёрла ў Горадні маці Максімава, а хутка пасьля гэтага бацька перабраўся ў Ніжні Ноўгарад і стуль — у Яраслаўль. Максіму ў мамэнт выезду з Бацькаўшчыны было толькі пяць гадоў. Пачатковая навука пачалася ў яго ў Ніжнім Ноўгарадзе дома: вучыў яго бацька. На

адзінаццатым годзе хлопчык паступіў у ніжагародзкую гімназію. У 1908 годзе, калі бацька перайшоў на службу ў Яраслаўль, і Максім перавёўся ў яраслаўльскую гімназію—у шостую клясу. Скончыў гімназію ў 1911 годзе. Тады зьезьдзіў на Бацькаўшчыну і бліжэй зыйшоўся з беларускімі адраджэнцамі, згуртаванымі пры „Нашай Ніве“. У тым-жа годзе паступіў у Яраслаўльскі Юрыдычны Ліцэй, які скончыў у 1916 годзе. Часта хварэў на грудзі,—у яго пачаў разьвівацца тубэркулёз. У кастрычніку 1916 году — ужо падчас вайны — паехаў у Менск, каб тут працаваць дзеля беларускае справы. На жыцьцё зарабляў, працуючы на становішчы сакратара „Губэрскага Прадавольственага Камітэту“. Увесь вольны час аддаваў ідэйнай рабоце. Ад напружанае працы стан ягонага здароўя шмат пагоршыўся. Тубэркулёз шыбка разьвіваўся, і ў лютым 1917 году Максім Багдановіч быў прымушаны выехаць лячыцца ў Крым. Там — у Ялце — адзінокі памёр 25 мая (па старому стылю—12 мая). Пахаваны на тамтэйшым магільніку.

Як бачым, толькі першыя гады свайго жыцьця — жыцьця йшчэ бязумоўна нясьведамага — правёў Максім Багдановіч у Беларусі. Сьведамае жыцьцё пачынаецца ў яго на чужыне. І вось адразу наша мысьль пачынае шукаць адказу на цікаўнае пытаньне: як-жа магло стацца, што ён ня толькі захаваў сваю беларускую душу ў чужацкім асяродзьдзі, але якраз там — на чужым грунце — вырас на сьведамага нацыянальна Беларуса. Як там— на чужыне — стаўся беларускім паэтам? Чаму, хоць меў такую лёгкую магчымасьць пісаць у чужых мовах, а наўперад — у мове расейскай, якую чуў і навакол, і ў сябе дома, накіраваў свае творчыя сілы да беларушчыны? І — чаму чужая нацыянальная стыхія не захапіла дый не праглынула яго?

На ўсе гэтыя пытаньні „біяграфічны пратакол“ адказу, ясна-ж, даць ня можа. Дакладчык знайшоў яго ў тых досьледах аб жыцьці паэта, якія ўжо былі апублікаваны, і ў тых успамінах і карэспадэнцыях сучасьнікаў Максіма Багдановіча, якія часткова толькі ведамы шырокаму грамадзянству.

Галоўнымі дзейнікамі, якія вызначылі жыцьцёвы й паэтыцкі шлях Максіма Багдановіча, як сьцьвярджаюць ягоныя біографы, былі: спадчыннасьць, дамовая атмасфэра, вонкавае культурнае асяродзьдзе, кнігі, урэшце — беларускі адраджэнскі рух і сьведамая воля паэта. На ўсіх іх неабходна хоць-бы коратка затрымацца.

Сям'я Багдановічаў з паходжаньня — беларуская сялянская сям'я. Дзед Максімаў, Юры, быў яшчэ прыгоньнікам — кухарам у двары абшарніка Лаппы, у Бабруйшчыне. Гэта быў звычайны чалавек, які, здаецца, не пакінуў сваім патомкам ніякае духовае спадчыны. За тое шмат пакінула ім жонка ягоная, Анеля, якая — паводле слоў Адама Багдановіча — адзначалася вялікімі матэматычнымі здольнасьцямі і была знамянітай апавядальніцай народных казак. Апошнюю здольнасьць яна ў свой чарод атрыма-

ла ў спадчыну ад сваей маткі, Рузалі, якая была адначасна і апавядальніцай, і паэткай, і — варажбіткай. Вось скуль плыве зацікаўленьне беларускай народнай творчасьцяй у Адама Багдановіча, першага інтэлігента ў сям'і, даволі ведамага працаўніка на ніве этнографіі, які і Максіму прышчапіў гэтае зацікаўленьне. Прышчапіў у значнай меры сьведама — падчас навукі ў хаце, падчас супольных экскурсіяў у вольныя ад працы гадзіны за места — на ўлоньне прыроды, на Волгу. Хаця ў доме Адама Багдановіча панавала ўжо расейская мова, але дух заўсёды быў тамака беларускі. Беларуская песьня, да якое з вялізарным піетызмам адносіўся Адам Багдановіч, глыбака ўзварушала і Максіма, чаруючы яго сваім харaством. Ён не здаволіўся тым, што чуў ад бацькі — на словах. Як толькі навучыўся чытаць, дык хапаўся за кніжку з беларускімі народнымі творамі і зачытываўся гэтымі творамі. Да таго-ж беларускія народныя казкі, апавяданьні, легенды, прыказкі Максім ад маленства пазнаваў ня толькі з кніжак ці ў бацькаўскім пераказе: у Ніжнім Ноўгарадзе жылі дзьве замужнія сястры Адама Багдановіча, і ў гэтых сем'ях, хоць вонкава — з гледзішча мовы — абмаскоўленых, гэтак сама быў крэпкі беларускі дух, панавалі беларускія традыцыі. Там была яшчэ адна крыніца, з якое Максім Багдановіч прагавіта піў народную паэзію. — Гэтак і спадчыннасьць і беларуская атмасфэра, панаваўшая ў найбліжэйшым асяродзьдзі, былі бясспрэчна тэй падставай, на якой магла вырасьці і сапраўды вырасла беларуская сьведамасьць Максіма Багдановіча — на чужыне.

Але-ж гэтага самага аказалася замала для ягонага большага брата, Вадзіма, які, захоплены агульна-расейскім культурным жыцьцём і рэвалюцыйным рухам, астаўся далёкім ад нацыянальна беларускіх заінтэрэсаваньняў Максіма. У вырастаньні беларускага пачуцьця ў Максіма мусіла адыграць вялікую, а мо' і рашаючую ролю псыхічная спадчына па матцы ягонай — Марылі. Адам Багдановіч неаднакротна падчырківае факт, што ў псыхіцы Максіма быў вельмі значны элемэнт „Малевіч“ (гэткае было дзявоцкае прозьвішча Марылі Багдановічавай). Маці Максімава была натурай вельмі ўражлівай, з нязвычайна разьвітай жывасьцяй выбражэньня, лёгка пабудлівай, з нахілам да паэзіі (адно яе расейскае апавяданьне было надрукавана ў часапісе „Гродненскія Губернскія Вѣдомости“ за 1893 год). Большасьць гэтых рысаў матчынае псыхікі з дзяцей пераняў толькі Максім. І хіба-ж дзякуючы ўспадкаванай гэтак асаблівай уражлівасьці сваей так горача прыймаў ён да сэрца ўсё, што датычыла далёкае, нязьведанае, казачнае Беларусі. Максім Багдановіч сам некалі апавядаў дакладчыку, што гэтая далёкая і фактычна зусім нязнаная йшчэ Бацькаўшчына нейк дзіўна чаравала яго і вабіла к сабе ад таго часу, як ён пачаў жыць сьведамым жыцьцём: самае імя яе выклікала ў душы паэта дзіўнае ўражаньне, і здавалася яму тады, што вось-вось брызнуць сьлёзы ў яго із вачэй.— Вось чым можам вытлумачыць тую акалічнасьць, што Вадзім

і Максім, родныя браты, аднолькава ўзгадаваныя бацькам, узрастаўшыя ў тэй самай духовай атмасфэры, чытаўшыя тыя самыя кніжкі з багатае бацькавае бібліятэкі (у тым ліку беларускія этнографічныя зборнікі, беларускія вершы Дунін-Марцінкевіча і Бурачка і г. д.), аказаліся такімі рознымі і сваімі характарамі, і зацікаўленьнямі, і ўрэшце — ідэолёгіяй. На Максімаву паэтыцкую душу творы нязвычайна багатае фантазіі беларускага народу дзеялі шмат мацней, чым на душу брата ягонага: *струны душы паэта гучэлі заўсёды ў унісон з струнамі душ тварцоў беларускіх народных казак, легенд, песьняў.*

Максім рана пачаў рабіць спробы пісаньня пабеларуску. Спробы гэныя былі беспасрэдным вынікам таго знаёмства з беларушчынай, аб якім гутарылі вышэй. У 1906 годзе адна сваячка Максімава выпісала для яго „Нашу Долю" і пасьля „Нашу Ніву". І вось з гэнага мамэнту паэта, які дагэтуль ішоў сваім беларускім шляхам толькі вобмацкам, ня маючы перад сабой ніякіх выразна сформуляваных нацыянальных ідэалаў, зьліваецца з беларускім адраджэнскім рухам, стаецца сьведамай часткай яго, крысталізуе свой нацыянальны ідэал і вызначае сабе свой жыцьцёвы шлях ужо *зусім сьведама.*

Бясспрэчна, што на афармленьне беларускае ідэолёгіі Максіма Багдановіча ўплывала ня толькі сямейная атмасфэра і пагляды й настроі бацькі ягонага, ня толькі беларускія кніжкі, а пазьней — беларуская адраджэнская прэса: вялікую ролю тутака адыгралі і тыя жывыя людзі з вонкавага сьвету, якія ў Яраслаўлі падтрымлівалі зацікаўленьне паэта беларушчынай, ды той высокі культурны ровень наагул, на які ўзьняўся Максім Багдановіч дзякуючы свайму прагавітаму імкненьню да веды. Спасярод жывых людзей вельмі дадатна ўплывалі на паэта перадусім тыя *перадавыя прадстаўнікі расейскае інтэлігенцыі,* якія, дзякуючы сваей дэмакратычнай ідэолёгіі, здолелі зразумець яго і з пашанай ды спачуваньнем аднясьліся да захапленьня ягонага беларушчынай. З другога боку — тыя прыпадкова аселыя на чужыне беларусы, у значнай меры ўтраціўшыя свой вонкавы нацыянальны воблік, але захаваўшыя сваю беларускую душу. Гэткімі былі: малады выкладчык гісторыі ў Ніжнім Ноўгарадзе, Кабанаў, з якім Максім Багдановіч захаваў сувязь і пасьля пераезду ў Яраслаўль, перапісываючыся з ім; і выкладчык літаратуры ў Яраслаўлі, Белавусаў, „типичный гуманист" (як яго характарызуе Адам Багдановіч). У шырокім кругазоры абодвух беларускае пытаньне знаходзіла для сябе адпаведнае месца, але заўсёды ў сувязі з праблемамі шырэйшага, агульна-людзкага, сусьветнага значэньня. І гэты ўплыў, пэйне-ж, адыграў немалую ролю ў пастаўленьні і Максімам беларускае справы на *шырокім грунце агульналюдзкім.*

Дзеля апошняга галоўнай падставай паслужыла, пэўне-ж, уся сыстэма ўзгадаваньня дзяцей Адамам Багдановічам. Як чалавек высока культурны, Адам Багдановіч стараўся даваць сваім

дзецям усё тое найлепшае, што знаходзіў у сусьветнай літаратуры. Гэтай мэце служыла і ягоная багатая прыватная бібліятэка, аб каторай Максім у гутарцы з адным сваім прыяцелем неяк сказаў:

„Мяне ўзгадоўваў бацька. Я вам неяк паказваў ягоную бібліятэку. У ёй ёсьць усё істотнае, што калі небудзь зьяўлялася ў літаратуры ўсяго сьвету. Бацька пачынаў з таго, з чаго пачынае кожны народ у сваей творчасьці: з эпосу. Мы ўжо дзяцьмі ведалі „Рустэма й Зораба“, „Іліяду“, „Калевалу“, быліны і г. д. Пасьля мы прыступілі да лірыкі і драмы. Ведама, галоўная ўвага зварачалася на славянскія літаратуры“...

Максіма Багдановіча захапляла кніжка,—як навуковая, так і з галіны літаратуры. Ён у меру сваіх сіл і магчымасьцяў знаёміўся з усімі галінамі веды чалавечае: гісторыяй і тэорыяй літаратуры, агульнай гісторыяй, этнографіяй (перадусім славянскіх народаў), філёзофіяй, прыродазнаўствам, соцыяльнымі навукамі. Ён імкнуўся прысвоіць сабе чым больш мастацкіх твораў чалавечага генія — і то прысвоіць не ў перакладах на нейкую чужую мову, а ў орыгіналах. Дык рабіў вялізарныя высілкі, каб аўладаць чужымі мовамі. Чытаў у орыгіналах грэцкіх і лацінскіх клясыкаў, нямецкіх, францускіх і італіянскіх паэтаў. Знамяніта ведаў расейскую мову й літаратуру; паукраінску і чытаў, і даволі добра пісаў; навучыўся польскае мовы; чытаў пачэску і пасэрбску. І вось — пры такім шырокім ахопе сусьветнае літаратуры — захапленьне беларускай народнай творчасьцяй, а пасьля беларускай адраджэнскай ідэяй ня толькі ў яго не слабела, а наадварот, усьцяж крапчэла. Чым больш красы пазнаваў ён у чужых літаратурах, тым больш бачыў яе і ў сваей роднай. І сам захацеў стацца тварцом гэтае красы — у беларускай мове. Максім Багдановіч рана задаўся мэтай гэтак вывучыць беларускую мову, каб мець магчымасьць зусім свабодна пісаць пабеларуску. Здаволіць патрэбу пісаньня паэтыцкіх твораў мог-бы лёгка ў расейскай мове (дый добрую жменю вершаў парасейску напісаў!); але паэт, паводле слоў ягонага бацькі, гэты *лёгкі чужы шлях адкінуў і выбраў больш цяжкі шлях — родны.* Усе перашкоды, усе труднасьці на сваей дарозе Максім Багдановіч перамог. Перамог — дзякуючы сіле сваей волі, аб якой бліскія да яго людзі апавядаюць цікаўныя рэчы. Гэтак, паводле слоў Аркадзя Смоліча, Максім Багдановіч, прыехаўшы ў 1916 годзе ў Менск, не хацеў піць гарбаты з цукрам. Ніякія просьбы гасьцінных людзей не маглі нічога тутака дапяць. Паэт казаў проста, што ня хоча цукру, і ўсё. Але Смолічу расказаў запраўдную прычыну: даведаўшыся, што беларускія сялянскія дзеці зусім не дастаюць цукру, ён пастанавіў гэтак сама яго ня ўжываць, бо яму сорамна было ў такіх варунках піць салодкую гарбату. І свайго зароку ніколі не нарушаў.

Перамагаючы труднасьці языка, Максім Багдановіч тварыў у беларускай мове паэзію, вартасьць каторае выяўлялася *не*

выключна ў красе вонкавых форм: ён пашыраў круг тэмаў яе, даваў у мастацкай форме думкі, *вартасныя і незалежна ад харства формы.* Апошняе — вынік не тэндэнцыі, а рэзультат яго ўласнага духовага багацьця, яго ўласнае высокае духовае культуры. Сваім духовым багацьцем дзяліўся ён з сваім народам і ў гэтым бачыў галоўнае заданьне свайго жыцьця.

У дзіцячыя гады Максім Багдановіч, паводле слоў бацькі ягонага, быў хлопчык вельмі рухавы, жывы. Пазьней, — у меру разьвіцьця ягонага духовага жыцьця,—гэная жывасьць усё больш чэзла. М. Б. пачынае зачыняцца ў сабе, думаць і тварыць насамоце. Гэткім пазнаў і дакладчык нашага паэта. Гэта, аднак, ня значыць, што ён перастаў цікавіцца шырокім грамадзкім жыцьцём. Наадварот: ён далёкі ад „Лермонтовшчыны", да якое адносіцца вельмі крытычна, і жыве заўсёды інтарэсамі грамадзянства — і тамтэйшага, на чужыне, і свайго беларускага — на Бацькаўшчыне. Але служыць хоча *толькі апошняму.*

Дзеля зразуменьня творчасьці Багдановіча неабходна затрымацца крыху і на яго інтымных перажываньнях.

Як ужо ведаем з „біографічнага пратаколу", Максім Багдановіч — у меру свайго фізычнага дасьпяваньня — пачынае ўсё часьцей хварэць. Гэта — зачаткі страшнае хваробы, запраўднага біча чалавецтва — тубэркулёзу. Яго лечаць, стараюцца падмацаваць ягоны арганізм. На нейкі час здаецца, што хвароба прыпынілася. Але ў студэнцкія гады Багдановіч залішне напружвае свае сілы, і арганізм ягоны губляе адпорнасьць на хваробу. Паэт адчувае гэта і мае поўную сьведамасьць таго, што яму пагражае хуткая сьмерць. „Я бальны бясскрыдлаты паэт" — гаворыць ён у адным із сваіх раньніх вершаў, — „мая песьня ўжо сьпета". Гэта мусіць выклікаць у душы ягонай сум, маркотнасьць, якімі ў некаторыя мамэнты ахварбуецца і ягоная паэзія. Але ні хвароба, ні пэрспэктыва хуткае сьмерці ня могуць забіць у ім таго, што неадлучна ад моладасьці: жаданьня кахаць. І ён кахае. Біографы яго адзначаюць некалькі гэткіх глыбейшых перажываньняў, хоць далёка не заўсёды прадмет каханьня быў выбраны ўдачна. За тое заўсёды каханьне яго было нязвычайна чыстае, як быццам сьвятарнае. З вялізарнай пашанай адносіўся ён да жанчыны — маткі, — у раджэньні дзіцяці бачыў найважнейшае яе заданьне. Апошнія гады перад сьмерцяй лятуцеў аб тым, каб мець сваё дзіця. Але лятуценьні яго ў гэтым кірунку асталіся бясплоднымі.

— Ня буду — закончыў першую частку рэфэрату А. Навіна — даўжэй затрымлівацца над гэтак званым менскім пэрыядам жыцьця Максіма Багдановіча — над тым апошнім годам жыцьця паэта, калі ён, скончыўшы ліцэй, прыехаў у Менск, каб тутака працаваць дзеля беларускае справы. Разгляд грамадзкае дзейнасьці М. Б. прымусіў-бы мяне адхіліцца ад майго шляху, і я тут адно толькі адзначу, што грамадзкая праца М. Б. ў Менску была шырокая і align рознастайная, ды што іменна яна скараціла

жыцьцё паэта. Бо-ж трэба прыпомніць, што гэны час — канец 1916 і пачатак 1917 г. г. — быў час пераломны, час, калі валілася старая царская ўлада ў Расеі, і перад беларусамі паўсталі вялікія магчымасьці. Гэта быў час, калі сярод беларускіх народных масаў пачынаўся магутны *ўздым,* калі радзіўся вялізарны *энтузыязм* на грунце сьведамасьці, што справа беларуская выплывае ўрэшце на шырокія воды, што старыя сны-лятуценьні першых адраджэнцаў мусяць урэшце збыцца. На гэтым грунце вырас, пэўне-ж, энтузыязм і ў Максіма Багдановіча, які астачу сваіх жыцьцёвых сілаў паклаў гэтак ахвярна на аўтар беларускае ідэі. —

Вось у якіх варунках кшталтавалася душа Максіма Багдановіча. Вось па якім шляху ішло разьвіцьцё ягонае беларускае ідэолёгіі. Вось як вырас з яго — беларускі паэт.

---

* * *

Не, я не скажу табе,
як цісьне камянем грудзі
боль... Не скажу,
як крывавяцца раны...
як пякуць мазалі
і як цяжка...
эх!...
не скажу...

Я скажу табе толькі аб зорах
і аб ціхай вясьнянай начы,
аб месяца чарах,
аб руччы...

Ты сьмейся!...
Бо я не скажу табе,
як цісьне камянем грудзі
боль... як пякуць мазалі...
як раны крывавяцца...
і як цяжка...
Эх!...
не скажу...

2.V.37 *А. БЯРОЗКА*

Ноч каля буды

Умурзаны месяц выпаўз на мутнае неба,
плюнуў агідай на хмары анэмічным, жоўтым сьвятлом...
Сёньня месяц у поўні. Ён сёньня на небе тыранам
самаўладным... Ён зоры топча — круглы, жоўты і горды—
месяцу ў зубы цяжкі бот ня ўдарыць;
пра долю сабачую
месяц ня ведае. Бо дзьве сабачыя долі:
або валачыць ланцуг і аброжу, або лоўка прад панам
хадзіць на задніх лапках...
І хацеў-бы сабака
упіцца зубамі ў халоднае месяца цела —
хай не сьмяецца з сабачай яго закрываўленай морды,
хоць пакуль запячэцца кроў і на ранах струпы закарэюць!..
Але месяц высока... Не таму яго дабываці,
каму цяжкі ланцуг і цяжкі бот долу сагнулі шыю.
І ён не сарвецца, ня блісьне клыкамі...
Ён толькі балюча завые.

29.X.1937. *АНАТОЛЬ БЯЗОЗКА*

Падзяліцца хачу...

Падзяліцца хачу з вамі радасьцяй сяньня, лапцюжнай вёскі,
і горам,
расказаць, як растуць, як цьвітуць мазалі, ад працы, ад плуга;
як скрыпела плячо, — ці мо' быльнік з мяжы сьпеў расплёскаў
[над ніўкай нязгоранай...
Шкадаваў, што ўжо хтось больш ня топча шэрай ральлі,—
[нудзіўся глуха...
Радасьць...
яна там, дзе яшчэ хтось спаткаці вясну спадзяец-
[ца з хлебам чорным...
Радасьць —
калі з хворых грудзей сіл апошніх да рэшты
[ня высмактала зьмяёй—ліхагодзьдзе,
калі сьцюжай асеньняй сагрэцца душу прамерз-
[шую горне сьвятло яркіх, цёплых надзей...
Я малюначак дам: —
гэта ў позьнюю восень—ужо мараза-
[мі — патрос сівы госьць,
а ён — бачу — босы... так, босы, валокся за плугам,
[сьледзіў разоры...

Можа зьдзівіцца хтось, а паверце, што сэрца таксама білося там
[— пад кашуляй, дзяругай
змагаючы гора!

Гора сяньня прад сьмехам пужліва бяжыць ад сяла, галоднае
[бродзіць...

Так, я бачу няраз, як сьмяюцца кашулі зрэбным палыновым
[сьмехам!

Сьлёз няма... а ў вачох не пагас, —
ён калыша грудзьмі, ён цьвіце, як зоры срэбныя,
імпат адзіны праменны, з пад саломенных стрэхаў,
адзінае слова:
жыць хочам — і будзем жыць!

З вясьняных песьняў

Быў абуджан рана я
песьняю зары.
Сонца разсьмеянае
полымям гарыць.
Шалясьцела росамі
маладая рань,
брылянцістым розсыпам
сьмехам серабра.
Пакаціўся нівамі
сьпеў вускіх разор,
птушкамі пужлівымі
абудзіўся бор.
Пяяць песьні хочацца,
хоць душа баліць...
Цені хмарак коцяцца
па грудзёх зямлі.
Эх, чаго-ж, працоўная
Маці Беларусь,
ты ў красу чароўную
сумная чамусь!...
Не гаруй, лапцюжная,
зьменяцца гады, —
звоняць раці дружныя —
маршам маладым;
падрастаюць сокалы, —
як-жа не пяяць! —
далеч сінявокую
хочацца абняць.
Што-ж, хоць боль, а раджу я —
песьню весялей!
Ходзіць голь жабрачая...
ходзіць па сяле...

М. ВАСІЛЁК

З раману „Праз Гады“*)
(адрывак)

Сыта палуднавалі. Пасьля полудня адпачывалі ў пакоях, а пазьней, напіўшыся кавы, гулялі ў садзе, блукалі па сьцежках, пасыпаных жоўтым пяском і гутарылі.

Прафэсару Пілацеяву ільсьціла, што малады і даволі вядомы прафэсар-хімік Галынскі, вядомы ў Пецярбурзе, як крайні радыкал у сваіх палітычных пераконаньнях, прыехаў да яго на час летніх вакацыяў. У Пілацеява ў сувязі з гэтым былі свае меркаваньні. Ён дэпутат дзяржаўнай думы. Як такі, ён лічыць сябе пераконаным земцам. Слава такая даходзіць і ў гэныя месцы, на ягоную радзіму і Пілацеяву хочацца, каб гэная слава стала больш моцнай. А ўмацаваньню такой славы, як нішто іншае, можа садзейнічаць прысутнасьць Галынскага, ягоныя разважаньні ў прысутнасьці Пілацеяўскіх суседзяў і знаёмых.

— Вось сюдэю хадзем, я пакажу вам пітомнік. Гэта справа майго агранома... Нязвычайны чалавек, я вам скажу...

Па-над сьцежкаю плавалі ў цёплым паветры пярэстыя матылі, снавалі ў паветры ўзорыстыя фантастычныя тканіны. Нізка над самай зямлёй гудлі чмялі і пчолы. Сытыя ад мёду пчолы цяжка падалі на пахучыя краскі і калыхаліся на лёгкіх іхніх сьцяблах, упіваючыся салодкім, ліпкім мёдам. А над густым царствам красак, паклаўшы цяжкае ад пладавіны гальлё на арэхавыя падпоркі, стаялі радамі шырокія куртатыя яблыні. З галін спакойна і ўрачыста зьвісалі буйныя яблыкі. Яблыкі загаралі на сонцы, ружавелі, наліваліся празрыстым вінным сокам і пахлі. Пахла яшчэ скошаная ў ранку, павяўшая трава.

Збоку, паміж бэзавых белых кустоў мільганула і зьнікла чыясь постаць, а яшчэ цераз хвіліну Галынскі ўбачыў агранома. Ён сядзеў на лавачцы побач з жонкай Пілацеява і нешта цікавае апавядаў ёй. Сьведчыла пра гэта тое, як уважліва слухала яна яго, і тое, з якім захапленьнем гаварыў ён, час-ад-часу паказваючы рукамі памеры нейкіх рэчаў.

Паходзіў аграном з сям'і гарадзкіх мяшчан-крамнікаў, але ў гэтай прафэсіі быў няўдачнікам і хутка выбраў другую, не па свайму паходжаньню, і любіў пакпіць над крамнікамі, гэтым самым як-бы помсьцячы ім за тое, што не прынялі яны яго ў сваё асяродзьдзе. Кпіў над імі, друкуючы ў мясцовай павятовай газэце вершаваныя фэльетоны, бо быў акрамя ўсяго іншага і літаратарам. Гэную сваю працу ён больш за ўсё паважаў, а на прафэсію земскага агранома глядзеў, як на крыніцу, што дае яму сродкі для жыцьця.

Зімою аграном часьцей за ўсё жыў у горадзе, а на лета

*) „Праз Гады“, раман. Бач. 395, нлб. 1. Фармат 8°. Выданьне другое. Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі. Менск 1936.

прыяжджаў у Пілацеяўскі маёнтак, блукаў па лесе і па полі, зрэдку даючы такія-сякія парады панскаму эканому, і пісаў вершы.

Пілацеяў да агранома неяк прывык і пасябраваў з ім. Падабалася яму аграномава празьмерная ветлівасьць і паслухмянасьць і яшчэ тое, што ўмеў агроном вельмі прыгожа гаварыць. Калі зьбіраліся да Пілацеява паны суседзі, агроном заўжды быў цэнтрам увагі. Ён скрозь патрапляў у пару: там анэкдот раскажа, там усьміхнецца акурат у патрэбную хвіліну, там слова трапнае кіне, а то, як засумуюць госьці, пачне забаўляць іх і развесяліць, прымусіць зарагатаць. Што-ні-што пасьпеў пачуць пра яго і Галынскі і таму не бяз зацікаўленасьці запытаў у Пілацеява, хто такі ягоны агроном.

— Сузон Іванавіч цікавейшы чалавек, карысны чалавек. Дзіўна, але калі-б ён раптам зьнік, мне чагось не хапала-б. Гэта тып інтэлігента з народу, якіх мала, якія дужа патрэбны, без якіх мы шмат у чым як бяз рук. Шмат у чым. Я пра гэта ня раз думаў, назіраючы за студэнтам. Ён мог-бы быць узорам для нашае моладзі.

— Можа быць, можа быць.

— Вы ня верыце? А я пераконаны ў тым, што ён спадабаецца і вам, Міхаіл Палікарпавіч. Прыемны чалавек, скажу я вам.

— Можа быць, я не спрачаюся. Я толькі хачу сказаць, што мы задужа багата ўзораў прыдумваем для нашай моладзі і, выбіраючы іх, кіруемся толькі сваімі густамі. З гэтай прычыны моладзь наша ня ўмее быць падобнай на тых, каго мы раім за ўзор для яе.

— Прабачце, але мне здаецца, што ў вас гэта ў прывычку ўвайшло: абавязкава і ўва ўсім супярэчыць агульна-прынятаму.

— Гм... а пры чым-жа тут агульна-прынятае?

— Я маю на ўвазе нашыя спрэчкі аб дзейнасьці земстваў, пакольхі Сузон Іванавіч акурат і зьяўляецца працаўніком земства. Такіх працаўнікоў па ўсёй Расеі тысячы, дзесяткі тысяч. Іхняя роля ў жыцьці рускага народу не маленькая. Па адным, няпрыкметна, яны робяць вялізарную справу насаджэньня сельскагаспадарчай культуры...

— Прабачце, Феакціст Антонавіч, я дужа мала часу ў вас, але мне здаецца, што агроном ваш ня бывае на сялянскім полі.

— Гм... Гэта ня зусім так. І пры тым самае важнае паказальнае поле, а яно на мяжы з сялянскімі палосамі. Яны маюць магчымасьць бачыць непасрэдную карысьць, якую даюць аграномавы парады. Вы, Міхаіл Палікарпавіч, ня хочаце бачыць маштабу нашае дзейнасьці. Уся Расея ахоплена дзейнасьцю земстваў. Уявіце сабе гэта і вы адчуеце грандыёзнасьць нашае дзейнасьці. Земства — гэта ўцялесьненьне сапраўдных інтарэсаў народу.

— І ўсё-ж гэта толькі крошкі, калі браць Расею з яе патрэбамі. Радзіма наша шмат у чым вінавата перад рускім народам. Нашаму пакаленьню варта-б скінуць са сваіх плеч грахі

нашых продкаў. Ськінуць іх можна сьмелымі дзеяньнямі, справамі. А ў нашых плянах, Феакціст Антонавіч, мне здаецца, больш меркаваньняў і асьцярожнасьці, чым справы.

— Гэта няпраўда. Няпраўда, Міхаіл Палікарпавіч. У маладосьці рукі задужа вялікія, яны ўсё адразу захапіць хочуць. Маладосьці скрозь цесна, усяго мала. Палітыка за гэта маладосьці і ня любіць, палітыка праз гэта заўжды з маладосьцю ў сварцы.

— Маладосьць — не загана. — Галынскі адкінуўся ў бок і, сагнуўшыся, падняў жменю скошанае травы, паднёс яе да твару. — Чалавецтва тады толькі-б і было шчасьлівым, калі-б ішло да сваіх ідэалаў крокамі маладосьці, а не старасьці, якая баіцца неасьцярожных крокаў, і таму часьцей за ўсё ахватней топчацца на адным месцы, а ня йдзе наперад. Як нідзе гэта шкодна ў Расеі, Феакціст Антонавіч, патрэбна дэмакратыя, шырокая, сапраўдная, чыстая дэмакратыя, якая паставіла-б Расею маральна поплеч з перадавымі эўрапэйскімі дзяржавамі. А то нас хутка абгоніць Кітай. Так, так, нават Кітай. Нам патрэбна такая дэмакратыя, якая мела-б маральнае права гаварыць ад імя ўсяго рускага народу і народаў, якія насяляюць Расею. Дэмакратыя, якая раз і назаўжды скончыць з дэспатыяй. А пакуль што вялікім дакорам для Расеі, для нас стаяць у нас перад вачыма такія падзеі, як пецярбургскія студэнцкія пятага году. У гэтым праклятьце Расеі, наша ганьба...

— Ну, Міхаіл Палікарпавіч, гэтак нельга. Патрэбна больш ая цьвярозасьць. У палітыцы цьвярозасьць самая неабходная якасьць. Палітыка ня мае права гарачыцца і, прабачце, хапаць цераз край, як гэта робіце вы, мой малады сябра.

— Вы патрабуеце большай цьвярозасьці? Добра. Я буду разважаць так, як вам хочацца... Расея эканамічна і культурна засталася далёка ззаду ад эўрапэйскіх дзяржаў. Прычына гэтаму — дэспатычны парадак. Дэмакратыя будзе вялізарным стымулам да прагрэсу. Дайце Расеі даподлінную дэмакратыю, і цераз пару дзьве дзесяткаў год, а можа яшчэ і раней, яна стане ў адзін рад з перадавымі цывілізаванымі краінамі Эўропы. Расея ськіне тады з сябе ўсе сьляды азіятчыны. Вось, паважаны Феакціст Антонавіч, мой плян, выкладзены зусім цьвяроза.

— Я разумею вас, Міхаіл Палікарпавіч, але зразумейце-ж і вы мяне. Паспрабуйце зрабіць гэта і вы ўбачыце вялікую крэўнасьць нашых ідэалаў. Хіба-ж мы не таго самага хочам?—Піляцеяў шырока разьвёў рукі. — Толькі мы, Міхаіл Палікарпавіч, з магчымасьцямі лічымся, а вы ня хочаце лічыцца. Земцы ня ворагі дэмакратыі, а яе саюзьнікі. Так, так, самыя блізкія яе саюзьнікі. Нашы ідэалы гэта і ёсьць рэальнае ўвасабненьне тае дэмакратыі, пра якую вы гаворыце. Так, так, так яно і ёсьць і іншай формы для свае дэмакратыі вы ня знойдзеце. Мы робім для народу і ад яго імя.

— Гэта, Феакціст Антонавіч, ня зусім так.

— Не, так, так, Міхаіл Палікарпавіч, толькі так...

Сьцежка павяртала за кусты маліньніку. І адразу на завароце Пілацеяў змоўк і спыніўся, углядаючыся ў прасьцяг саду, дзе купкай стаялі дзеці, а пасьля рашуча пайшоў да іх проста па садзе. Сьледам за ім пайшоў і Галынскі. Калі падыйшлі бліжэй да месца, дзе былі дзеці, Галынскі спалохана спыніўся.

На дрэве, на таўстой галіне сядзеў Пілацеяў, студэнт, і трымаў у руцэ канец вяроўкі, якая была наматана ў некалькі столак на галіну. Каля дрэва паўкругам стаялі дзеці, а пасярод іх на вяроўцы вісеў стары эканомаў сабака. Студэнт то шморгаў вяроўку ўгару і падымаў сабаку над зямлёй, то апускаў яго долу. Вяроўка сьціскала сабаку горла і ад болю сабака, калі яго падцягвалі ўгору, пішчаў, выгінаўся і падкідаў у паветры сваё старое цела, каб гэтым аслабіць вяроўку, якая душыла за горла, і дрыгаў заднімі лапамі, шукаючы, каб у што-кольвеч упёрціся імі. Лапы апоры не знаходзілі і сьмешна дрыгалі ў паветры, а дзеці рагаталі сьледам за студэнтам. Студэнт тузаў за вяроўку, прыцмокваў языком і пакрыкваў на сабаку. Урэшце, акурат, калі Галынскі з Пілацеявым падыйшлі ўжо зусім блізка, сабака павіс нярухома, выставіўшы перад сабою лапы, а потым з адчаем замахаў лапамі, каб учапіцца імі за вяроўку, закруціў галавою, ловячы вяроўку зубамі, але не злавіў яе і, абяссілеўшы, павіс, драпаючы лапамі перад сабою паветра.

— Кіньце! Што вы робіце!

Галынскі кінуўся да дрэва, але яго абагнаў Пілацеяў-бацька. Ён выхапіў з сынавых рук вяроўку, шмаргануў яе ад сябе і цела сабачае паступова, як разматвалася вяроўка, абсунулася на зямлю. Дзеці прыціхлі і адыйшлі ў бок. Студэнт пасядзеў яшчэ хвіліну на дрэве, зьбянтэжана ўсьміхаючыся Галынскаму і, не знайшоўшы ў таго спачуваньня свайму ўчынку, спрытна саскочыў з дрэва на зямлю.

— Вельмі цікава назіраць, як канае сабака,—сказаў ён.

— Сорам! — угневана сказаў да студэнта бацька. — Чорт ведае, чым ты займаешся. Сорам, Адам.

Галынскі разгублена азіраўся наўкола і маўчаў. Было жаданьне падыйсьці да студэнта і з абурэньнем сказаць яму адно толькі кароткае і грубае слова, але ён гэтага не зрабіў і толькі зьдзіўлена павёў плячыма, калі яго запрасілі пайсьці з саду да пакояў. Ён нічога не сказаў студэнту і тады, калі той зноў загаварыў пра сабаку.

— Бачылі, як яна драпала кіпцюрамі паветра? Інстынкт. Шукала, каб за што-кольвеч зачапіцца і выратавацца.

Цяпер ужо хацелася моўчкі падыйсьці і ўдарыць студэнта ў твар. Бацька разгадаў маўчаньне Галынскага і, каб хоць крыху разрадзіць яго, яшчэ раз сказаў да сына.

— Не разумею, як гэта прышло табе ў галаву такое глупства? Сорам... Чорт ведае, што такое. Ты мяне гэтым зусім зьдзівіў, я цябе не разумею... Ідзі, скажы, каб сабаку выкінулі з саду. А вы, Міхаіх Палікарпавіч, — зьвярнуўся ён да Галынскага,

разумеючы, што той хоча застацца адзін, — пэўне пойдзеце адпачыць? Ідзіце, а я займуся зараз гаспадарчымі справамі.

Галынскага Пілацеявы зьмясьцілі ў пакоі свае хатняе бібліятэкі. Тут ён спаў і тут праводзіў гадзіны, калі хацеў застацца адзін, або хацеў пачытаць. Невялікі ўтульны пакой бібліятэкі мясьціў у сабе цяжкі пісьмовы стол і дзьве шырокія шафы. Да іх цяпер далучыўся яшчэ драўляны, шырокі і нізкі ложак. Усё, і стол, і ложак, і кніжныя шафы былі зроблены цярплівым майстрам, які быў і надзвычай удалым разьбяром. Цяжкі стол упіраўся ў падлогу чатырма моцнымі зьвярынымі лапамі з вылушчанымі кіпцюрамі, а з-пад краёў яго і ва ўсе бакі пазіралі злосныя сабачыя пысы з аскаленымі зубамі. Па дубовых сьпінках ложка віліся кляновыя галіны ўперамежку з дубовымі, з якіх паміж лісьця зьвісалі, выпукляючыся, сытыя жалуды. Але прыгажэй за ўсё былі зроблены шафы для кніжак.

Шафы выстаўляліся сваімі багатымі, уквечанымі дзівоснай разьбой, краямі, непадобнымі адзін на адзін. То ад самай падлогі віўся ўгару густым вянком сьпелы, пажоўклы хмель, то абвісалі цяжкімі гронкамі сьпелыя, чырвоныя вішні, а то раптам шырока раськідаў сваё вецьце пышны ружовы куст. І ва ўсім гэтым пад зашклянымі дзьверцамі мясьціліся ў кружках выразаныя на дубе сілуэты вядомых пісьменьнікаў і паэтаў даўнейшых часоў. За ўсім гэтым панавала спакойная змрочнасьць, хаваючы ў сабе шчыльныя рады дарагіх і рэдкіх кніжак. Галынскі звычайна падоўга выстайваў перад шафай раней, чым адчыніць яе дзьверцы, і з-за шкла ў дзьверцах любаваўся кніжкамі, стараючыся адгадаць іх. У такія хвіліны ён клаў на шкло далонь рукі і слухаў, як ідзе ад шкла да рукі прыемны халадок і з ім спакой. Калі шкло награвалася ад рукі і рука пераставала адчуваць гэты холад, ён адчыняў дзьверцы і зноў стаяў перад кнігамі, выбіраючы якую-б узяць у рукі. Гэты раз ён больш, як звычайна, прастаяў каля шафы ў прасторы паміж яе расчыненымі дзьверцамі Быў тут свой асобны схаваны сьвет. Ад кніг ішоў своеасаблівы пах. Мацаючы вачыма іхныя вокладкі, Галынскі адгадваў назвы кніг, і тады пачыналі ажываць у ягоным уяўленьні даўно знаёмыя вобразы людзей. Некалі яны жылі, блукалі пешшу і ў карэтах па неабдымных прасторах Расеі і эўрапэйскіх дзяржаў, жылі ў сваіх маёнтках, служылі ў дэпартамэнтах і казённых канцылярыях, дзейнічалі, а пасьля, схопленыя пяром аўтараў, паслухмяна ўвайшлі ў кніжны сьвет, каб час-адчасу ажываючы са старонак кніг, напамінаць аб сабе і сваім часе. І цяпер жывымі бачыў іх Галынскі. Яны выглядалі з цёмнае глыбіні шафы, з-за шчыльных радоў кніг, выскальваліся ў злосных, саркастычных ухмылках, сьмяючыся над ім і яго сучасьнікамі.

„Недалёка ад нас адыйшлі вы“, — гаварылі іхныя вобразы і сьледам за імі гэта-ж паўтараў Галынскі. — „Так, недалёка, зусім недалёка. Расея павінна перажыць часы вялікіх палітыч-

ных і гаспадарчых рэформ, каб адыйсьці ад вашага часу", — казаў ён, зьвяртаючыся да ценяў-вобразаў, якія бачыў за кнігамі. — „Я буду жыць у другой Расеі, ня вашай, не дэспатычнай, а ў Расеі дэмакратычнай, у Расеі, якая будзе ўвасабленьнем пананаваньня розуму і справядлівасьці, я буду жыць у Расеі, у якой ня будзе месца такім, як вы, і такім, як вашыя пасьлядоўцы — мае сучасьнікі". Разам абодвума рукамі ён шчыльна прычыніў дзьверцы шафы і адышоўся да стала. На стале ляжай томік вершаў. Белыя старонкі з калонкамі вершаў заціснуты ў масыўную, цёмнага колеру, вокладку. Кніга такая заклікала абуджаць панурыя пачуцьці. Галынскі падняў кнігу са стала і наўгад разгарнуў яе.

„Уж слишком отрывочна жизнь и вселенная;
К профессору-немцу пойду непременно я;
Наверное жизнь не оставит он так:
Системы придумает, даст им названия...
Надевши халат и ночной свой колпак,
Он штопает дырки всего мироздания".

Галынскі прачытаў верш і, ня стрымаўшыся, раптам галасна зарагатаў.

— Ха-ха! У самы-б раз пачытаць гэта прафэсару-немцу... Ха-ха-ха! — гэтак-жа раптам змоўк. — „А мне?.." — Зноў наўгад разгарнуў кніжку і, шырока ўсьміхаючыся, некалькі раз галасна прачытаў радкі, якія трапілі на вочы.

„Как дивно солнце ни свети,
А все-ж оно должно зайти".

„Ну, ты брат, таго, відаць нарошна парашыў з мяне сягоньня пасьмяяцца... Ладна, сьмейся, калі так",—і яшчэ раз паўтарыў другі радок верша —

„А все-ж оно должно зайти".

І зноў зарагатаў, а тады згарнуў кніжку, паклаў яе на стол і, асьцярожна ступаючы па падлозе, каб не парушыць цішыні, што ўсталявалася ў пакоях, пашоў на вэранду. Парашыў ён пасядзець колькі хвілін на вэрандзе, а пасьля схадзіць на возера пакупацца. Апынуўшыся ў суседнім з вэрандай пакоі, ён спыніўся і застыў на месцы. На вэрандзе Пілацеяў гутарыў з сваім эканомам. Эконом высокі, цяжкі чалавек, цэлыя дні снуе то дзесьці ў полі, то па двары, тупаючы цяжкімі ботамі з высокімі, — аж за калені, халявамі і бесперастанку выцірае вечна ўспацелы свой лоб. Галынскага асабліва зьдзівіла адна эканомава прывычка. Ён ніколі не адзяе на галаву шапку, але абавязкава носіць яе з сабою ў левай руцэ, куды-б ня ішоў, ці далёка, ці блізка. У эканома на галаве лысіна, лысіна заўжды потная, але эканом выцірае пот толькі з ілба: правядзе насовачкай па ілбе раз, другі, сатрэ з ілба пот, і акурат, калі Галынскаму хочацца, каб ён выцер і лысіну, схавае насовачку ў кішэнь. Ад гэтага заўжды назаляе Галынскаму неадчэпнае жаданьне выняць з кі-

шэні сваю насоўку, падыйсьці да эканома і сьцерці з ягонай лысіны пот, які трымаецца на ёй густымі буйнымі кроплямі.

За час, як жыве ў гасьцях у Пілацеява Міхаіл Палікарпавіч, зьмеціў ён шмат чаго новага для сябе ў натуры Пілацеява. Гэтае новае і цікавіла, бо неяк не вязалася яно з агульным, што раней было склалася, уяўленьнем аб прафэсары Пілацеяве, дэпутаце Дзяржаўнай думы.

Зьдзівіла Галынскага ягоная хітрасьць, уменьне прытварацца. Пра што-б ён ні гаварыў у прысутнасьці староньніх, ён заўжды ўмее быць нязвычайна спакойным і добрым. Спакой асабліва ў пальцах рук. Гаворыць ён, паклаўшы тонкія пальцы рукі на край стала і спакойна трымае іх выцягнутымі, нібы на паказ выстаўляе іх. А Галынскі адгадаў, што робіць ён гэта сьвядома, каб па руцэ кантраляваць сябе. Спакой і добрасьць у Пілацеява зьнікае, калі ён гаворыць з кім-кольвеч адзін-на-адзін, ці то з эканомам, ці то з жонкай. У такі мамэнт акурат і трапіў цяпер на вэранду Галынскі. Пілацеяў стаяў, перавесіўшыся цераз стол, ушчарэпіўшыся рукамі за край яго і ня крычаў, а злосна шыпеў у бок да эканома. Эканом стаяў перад ім і, спалохана камечачы шапку, зусім, як селянін, апраўдваўся. Калі на вэранду вышаў Галынскі, Пілацеяў хуценька адхінуўся і сеў за стол і, яшчэ не пасьпеўшы схаваць злосьць, з робленай усьмешкай сказаў:

— Патравілі мужыкі сенажаць. Цэлы табун кароў па сенажаці прайшоў, а Ермалай Трыфанавіч,—ён кіўнуў галавой у бок эканома, — празяваў, не забраў табуна, пашкадаваў мужыкоў. А ім спускаць нельга. Чым больш ты ім спусьціш, тым больш яны табе нашкодзяць.

Эканом змаўчаў, а Галынскі папрасіў прабачэньня, што перашкодзіў ім і пайшоў у сад. Зьявілася думка, што гаворкі пра земцаў і іхныя ідэалы былі для Пілацеява накшталт эканомавай прывычкі насіць з сабою шапку і ніколі не адзяваць яе на галаву. Гэтыя гаворкі былі ў значнай долі модай і былі для знаёмых, для гасьцей і агулам для староньніх. У гэтым быў і адзін з сакрэтаў прывязанасьці да агранома, без якога Пілацеяву не хапала цэльнасьці. Сувязь з аграномам, з гэтым земскім дзеячом, толькі лішні раз падкрэсьлівала перад староньнімі лібэралізм самога Пілацеява.

Перад тым, як пайсьці да возера, Галынскі прысеў на лавачцы каля бурштынавага куста. Хутка мімаходзь па садзе, тупаючы цяжкімі ботамі па нагрэтай сонцам зямлі, прайшоў эканом. Ён ветліва заківаў Галынскаму галавой, махнуў рукою з насоўкай і выцер успацелы лоб, а тады нешта сказаў пра гарачыню. Галынскі сказанае толькі адгадаў, бо слоў не пачуў. І ветліва ўсьміхнуўшыся яму, гэтак-жа нешта нявыразнае сказаў пра надвор'е. З гэтым падняўся з лавачкі і пайшоў да возера.

Над возерным берагам, як і заўжды, шапялявілі лісьцем маладыя асіны. У самым гушчары іхным цырыкалі птушкі, а з краю,

паміж ствaламі іхнымі снавалі жоўтыя матылі. Далёка ў лесе за возерам, дзе плыло над верхавінамі дрэў вячэрняе сонца, трубіў пастух. Над возерам лёталі, сьцелючыся па-над самай вадой, ластаўкі, дзесьці ў берагах блізка былі іхныя гнёзды. Ветру зусім ня было і вада ў возеры стаяла спакойна, бяз ніводнае рабінкі. Прахладная глыбіня вазёрная была цёмна-сіняй, а на ёй, як застыглыя, нярухома ляжалі лёгкія пухавыя шматкі белаватых хмар.

У баку, улева ад месца, дзе стаяў Галынскі, бераг вазёрны зарос густым чаротам і асакой. Там, каля чароту, мятусіцца рыба. Час-ад-часу, гуляючы, выскачыць рыба, узаўецца над паверхняй вады, блісьне серабрыстай луской на сонцы і цяжка плёхнецца назад у ваду, парушаючы яе люстэрны спакой. Тады нараджаюцца ў вадзе і бягуць у бакі па возеры, забіраючы ўсё большы прастор, роўныя, як-бы кім разьмераныя кругі. Рыба пойдзе далёка на халоднае вазёрнае дно, а кругі яшчэ доўга жывуць, пакуль не сатруцца з люстэрна-гладкай вады.

На другім боку возера, над самым яго берагам, стаяць высокія, гонкія алешыны, глядзяцца ў вадзяную чыстую прахладу і ўбіраюць яе ў сябе густым лісьцем схіленых да самай вады галін. Захацелася Галынскаму ўвайсьці ў ваду і паплыць аж туды, да тых дрэў.

Не сьпяшаючыся, ськінуў ён з сябе вопратку, і хвіліну стаяў голы над вадою, гледзячыся ў яе празрыстасьць. Пасьля шырака разьвёў рукі, напружыў мускулы і зьвёў іх кулакамі ля плячэй. Дыхаў поўнымі грудзямі і дзівіўся, як высока ўздымаюцца грудзі і як многа раздаюцца яны ў шырыню. З паднятымі да плячэй рукамі, пайшоў у ваду. Вада абдала ногі холадам, і рукі ад нечаканага холаду выцягліся ўздоўж цела. Вада рабілася глыбей, і холад падымаўся па целе вышэй і вышэй. Вось ён пад самымі каленамі і гэта асабліва няпрыемна. Вось і калены ў вадзе і яна шчыкоча халадком бёдры. Вышэй і вышэй. Тады цела раптоўна лягло на ваду, а рука, закінутая далёка наперад, грэбла пад цела празрыстую тугую яе глыбіню. Раз, раз... Рукі адна за другой па чарзе кладуцца на паверхні вады, падмінаючы яе пад цела, а цела, лёгка сьхіляючыся то на адзін, то на другі бок за рукамі, плыве ад берага далей і далей. Галынскі плыў, не азіраючыся назад на пакінуты бераг. Было прыемна слухаць, як абдае цела прахладай вады і як сьцякае яна з плячэй, калі яны ўздымаюцца над вадой. З гары на цела плыла мяккая цяплынь, разбаўленая прахладай возера.

Прахлада падымалася ад вады. Яна лёгкімі подыхамі вецярка кратала твар, калі побач над самай вадою пралятала ластаўка. Ластаўкі цэлым табуном кружыліся, цырыкалі, падлятаючы зусім блізка да яго і пасьля адляталі далёка ў бок.

Хутка рукі стаміліся, і Галынскі лёг на ваду плячыма. Ляжаў спакойна, не напружваючы сіл, і ледзь прыкметна час-адчасу пашавельваў плячыма і мускулатурай рук.

Лежачы, дзівіўся на свае грудзі, на пальцы ног, якія тырчэлі з вады і на ўпалы жывот. Жывот то ўздымаўся над вадой, і яна павольна сьцякала з яго, то заплываў вадою, і тады грудзі здаваліся нязвычайна высокімі. Правай рукой чэрпаў ваду і паліваў ёю грудзі і твар. Прыемна было адчуваць сябе дужым і радасным. І ад таго, што адчуў сілу, зноў павярнуўся тварам да вады і паплыў наперад. Быў ён у гэты час на самай сярэдзіне возера. Алешыны з другога берагу ўсе былі далёкімі, недасяжнымі. Праплыўшы яшчэ колькі, Галынскі зноў адчуў стомленасьць у руках і падумаў, што да берагу не даплыве. Зірнуў у ваду. Вочы ўбачылі чорную бездань і тады зьнізу, ад жывата пашло па целе халадком адчуваньне далёкага дна, якога нагамі не дастаць. Нарадзіўся страх і скаваў цела і рукі. Сьпяшаючыся, ён павярнуўся, каб плыць назад. Рукі ўздымаліся над вадой і білі па вадзе часьцей, як трэ' было. Страх, што можна страціць сілы і ўтапіцца, авалодаў Галынскім. І ён адчуў, як твар пакрыўся потам. Абцяжэлі ногі і падалі ў ваду, цягнулі туды за сабою цела. Так здавалася Галынскаму. Спалоханы, ён яшчэ часьцей замахаў рукамі, пачаў, згубіўшы над сабою ўладу, бязмэтна біць па вадзе нагамі. Рукі ўмомант стаміліся і адмаўляліся працаваць. Нагу схапіла сударга. Каб выратавацца, ён паспрабаваў зноў легчы на сьпіну і адпачыць, але, як толькі лёг на сьпіну, адчуў, што цела ня хоча трымацца на вадзе, і тады зноў хутчэй лёг на ваду грудзьмі і ўжо, зусім не вападаючы сабою, плыў наўзгад у напрамку да берагу, плыў пахвілінна акунаючыся ў ваду ледзь ня ўсёй галавой, глытаючы ваду. Вада наплывала ў рот, у нос, у вушы і перамагала, перашкаджаючы дыханьню. Стомленае цела не хацела трымацца на вадзе і ўсё часьцей і часьцей зрывалася, ападаючы ў чорную бездань. Здавалася яшчэ адзін мамэнт і ўсё будзе скончана, бо рукі адмовяцца грэбці. Захацелася крычаць, клікаць кагось на дапамогу, але ня крыкнуў, бо рот заліло вадой.

— А вы спакойна, — сказаў нехта з боку. — Лягайце грудзьмі на маю руку вось так.

Галынскі адчуў, як нешта лягло пад грудзі і прыўзьняло іх і тады-ж убачыў, што побач з ім плыве зусім незнаёмы яму чалавек. Прысутнасьць гэтага другога адразу вярнула ўпэўненасьць у сваіх сілах.

— Прабачце. Я вельмі ўдзячны вам. Бяз вас маё становішча было-б даволі незайздросным. — Ён паспрабаваў усьміхнуцца. — І ўмею добра плаваць і вось неяк здаў, раптам, нечакана... Вельмі ўдзячны. Цяпер я паплыву сам.

— Гэта здараецца. Варта згубіць упэўненасьць, і цела пачынае ісьці на дно.

— Я хацеў даплыць да таго берагу, — Галынскі кіўнуў галавой у напрамку, адкуль плылі. — Пасьля зірнуў пад сябе ў ваду і збаяўся, што не даплыву. А тады і страціў сілы.

Падплылі да берагу. Першым на ногі стаў, палез на бераг

незнаёмец. З берагу ён нагнуўся, каб падаць Галынскаму руку. Падымаючыся за яго рукой з вады, Галынскі цяпер змог разглядзець рослага, шырокага ў плячах, мужчыну. Грудзі ў незнаёмца густа зарасьлі валасамі. Загарэлае цела, яшчэ мокрае з вады, адлівала цёмна-бурым блескам. І мімаволі Галынскі зірнуў на сваю руку, такую белую, параўноўваючы яе з рукой незнаёмца і адчуў сябе зусім слабым і бездапаможным, у параўнаньні з ім.

— Цяпер адпачніце, прафэсар, — запрапанаваў незнаёмец, і Галынскі, зьдзіўлены такім зваротам, уставіўся поглядам у ягоны твар.

— Я сустракаў вас яшчэ ў Пецярбургу, — вытлумачыў незнаёмец.

— З кім-жа я маю гонар гаварыць?

— Я тутэйшы настаўнік. Спрабаваў вучыцца ў Пецярбургскім унівэрсытэце і ў тыя часы часта чуў ваша імя.

— Як разумець вашае „спрабавалі вучыцца"?

— Па раду прычын я вымушан быў пакінуць унівэрсытэт. Гэта ня цікава для вас.

— Наадварот, нават вельмі цікава і, калі можаце, я прасіў-бы назваць прычыны.

— Я быў арыштаваным, а пасьля мяне паслалі сюды жыць.

— Нават так? Вашае прозьвішча дазвольце ведаць?

— Буднік, Павал Андрэевіч.

— Вельмі рад. Буду рад бачыцца з вамі. — Галынскі цяпер яшчэ раз уважліва аглядзеў незнаёмца з ног да галавы. — Вы, пэўне, зможаце багата цікавага расказаць з жыцьця сялян.

— Цікава, уласна кажучы, мала. Жыцьцё тут напоўжабрацкае, галоднае, цяжкае.

— Прафэсар Пілацееў, тутэйшы абшарнік, гаварыў мне, што суседнія вёскі цяпер выдзяляюць на хутары. Я думаю, што гэта значна палепшыць быт вёскі.

— Думаю, што ня так. Бяда ўся ў зямельным галадзе. А хутары зямлі не прыбавяць.

Гаворачы, настаўнік апрануўся і тады пашоў за Галынскім да месца, дзе ляжала ягоная вопратка. Калі апрануўся і Галынскі, яны селі на ўзгорку, на мураве. Настаўнік сядзеў, шырока расставіўшы ногі і пальцамі выскубваў з зямлі калівы муравы.

— У тутэйшых вёсках процантаў шэсьцьдзесят сялян ня маюць да чаго рук сваіх прыкласьці. Ім няма работы,—сказаў ён.

— Але ўсё-ж рэформа такая, мне здаецца, значна аздаровіць сельскую гаспадарку ў Расеі. Яна ўздыме агульны ўзровень сельска-гаспадарчай культуры. Мне здаецца, што сялянства ў значнай долі галадае таму, што знаходзіцца ў вялікай залежнасьці ад стыхійных сіл: ад пяскоў, ад засухі, ад забалочваньня. Няўзброенае ведамі, яно бездапаможна ў барацьбе са стыхійнымі сіламі прыроды.

— Селяніну перш за ўсё зямля патрэбна, прафэсар, а не рэформа. Зямля і сродкі. Над большасьцю сялянскіх хат вечна вісіць Дамоклаў меч нядоімак. Вечна стаіць здань голаду. Хутары гэтага ня зьнішчаць.

— А ўсё-ж-ткі. Гэта разьвязвае ініцыятыву тых, хто мае зямлю. Да ўсяго карысная дзейнасьць земстваў...

— Хутар разьвязвае ініцыятыву багатага, — перабіў яго настаўнік, а земствы што-ж, яны не для селяніна. Гэта справа дваранская. Агранам земскі сядзіць на панскім двары. Гласныя ад сялян у земстве, пасутнасьці, зусім безгалосныя, там галасоў больш дваранскіх, чым сялянскіх.

— Што-ж, па вашаму, трэба? — Галынскі цяпер адчуў, што ў сваіх развагах ён пачынае апірацца на аргумэнты, якія чуў ад Пілацеява. Хацелася і цяпер загаварыць пра неабходнасьць дэмакратычнага ладу для Расеі, але не ўяўляў, якім канкрэтным зьместам у дадзенай справе, у пытаньні пра зямлю, зможа ён напоўніць гэнае разуменьне дэмакрацыі, і таму маўчаў, слухаючы настаўнікавы развагі.

— Спрабавалі аслабіць зямельны голад перасяленьнем, — гаварыў настаўнік, — але ніхто ня ведае, ці ёсьць патрэбныя для гэтага запасы вольных зямель. Большасьць перасяленцаў, прамучыўшыся ў тайзе некалькі год, варочаюцца жабракамі назад. А хутары? Ну, што за хутар з дзьвёх дзесяцін? На гэты хутар селяніну трэба перанесьці ўсе свае будынкі. Будынкі старыя. На месцы яны стаяць, а крані — рассыплюцца. Такія хутаране стануць сапраўднымі жабракамі...

— Дык што-ж, ідэя аб дадатковым надзяленьні зямлёй?

— Ва ўсякім выпадку такая ідэя жыве ў масах сялян, а падзел на хутары зрабіў яе надзвычай папулярнай.

— Але-ж гэта пагражае новымі непарадкамі?

— Пагроза непарадкаў, пане прафэсар, будзе жыць датуль, пакуль панская зямля не пяройдзе ў рукі сялян.

— Так, можа быць, можа быць. Але справа ўся ў мэтадах. Мне здаецца, што вы ўсё-ж недацэньваеце ролі гэтай рэформы і ролі асьветы. Рост культурнасьці абудзіць ініцыятыву, знойдуцца крыніцы прылажэньня сіл, вырасьце праслойка моцных сялян, падымецца ўзровень ураджайнасьці... — Такі селянін не захоча доўгі час хадзіць пад ферулай урадніка. Ён пачне патрабаваць гарантыі палітычных свабод. Такі перад панам шапкі скідаць ня стане... на такіх можна будзе абапёрціся ў справе заваяваньня далейшых рэформ...

— Такіх будзе два-тры на вёску, а сотні ўсё-такі застануцца без зямлі і галоднымі. Ім ад усяго гэтага якая карысьць? Зямля патрэбна. Яна пятлёй на шыі ў кожнага селяніна. Пытаньне пра зямлю вырасьце ў страшную сілу і адыграе калі-небудзь у рускіх падзеях не апошнюю ролю. Ну, бывайце, я павінен пайсьці. Буду рад спаткацца з вамі і пагаварыць.

Вельмі рад! Бывайце! Абавязкава прыходзьце сюды, я тут заўжды.

Настаўнік надзеў шапку і пашоў ад возера нацянькі па асіньніку, а Галынскі паволі пашоў у двор, абдумваючы тое, што пачуў ад настаўніка, і тое, што гаварыў сам. І за сябе стала крыўдна, бо ўсё, што гаварыў, цяпер не пераконвала і яго самога.

На вэрандзе ў двары Галынскі застаў агранома, Пілацеява і яшчэ двух незнаёмых. З імі Галынскага пазнаёміў сам Пілацеяў.

— Каморнікі, — сказаў ён. — Праводзяць працу ў суседняй вёсцы. Пасьля зірнуў з вэранды ў бок, дзе заходзіла сонца.

— Дзіўна. Я, здаецца, яшчэ ніколі ня бачыў такога сонца.

Галынскі зірнуў на захад. Вялікае сонцава кола палымнеючы каціласяа па абрысу палёў за садам і краем сваім ледзь-ледзь краналася зямлі. На зямлі ляжалі доўгія, шырокія цені дрэў і ўзгоркаў. Зямля супроць сонца чарнела і, было падобна, уздымалася краем тым угару насустрач сонцу. Яшчэ колькі хвілін і сонца зьнікае, а пакуль яно гульліва кружыцца, павісаючы праменьнем на галінах самых далёкіх у садзе дрэў, на абрыўках хмар, што не пасьпелі сыйсьці за небасхіл. Хмары, апаленыя сонцам, таюць і расплываюцца па небасхіле. Гольле дрэў зьгінаецца да зямлі, а сонцаў круг растае, аплываючы па краях, расьцякаецца па небасхіле над самым краем зямлі густой чырваньню.

— Дзіўны вечар, — сказаў ён і так стаяў, залюбаваўшыся захадам сонца, слухаючы гаспадарову гаворку з каморнікамі.

Водблескамі толькі што адышоўшага дня ярка палымнела яшчэ на захадзе неба. Яшчэ начныя змрокі нясьмела туляліся ў лесе за рэчкай. Яшчэ толькі ў лагчыне над берагамі і над рэчкай паслаўся шызы туман, а да вэранды падышоў ужо летні вечар і стаяў за вэрандай, дзівячыся на яе з-за парэнч густа абплеценых зялёным хмелем. Вечар адчуваўся ўва ўсім: і ў навакольнай празрыстай цішыні, і ў няспынных, хоць і нясьмелых яшчэ крыках цьвіркуноў; і ў ажыўленым камарыным піску і дзынканьні жукоў. І яшчэ плыў вечар над зямлёю лёгкімі посьвістамі ў крыльлях запозьненых качак, што сьпяшаліся да возера.

На вэранду прынесьлі з пакояў лямпы і вячэру. І адразу за вэрандай змрок стаў гусьцейшым, вечар падышоў яшчэ бліжэй. Большай стала і прахлада.

Галынскі сеў за стол. Ён дзівіўся наўкола сябе на прысутных і ніяк ня мог вызваліцца ад дум пра гутарку з настаўнікам. Кіпеў на стале самавар. Ён слухаў, як булькае ў самавары вада, а перад вачыма паўставалі вобразы, народжаныя словамі настаўніка. Дзесьці далёка ў лесе, у баку ад возера, неспакойна часта рыкала карова. Галынскі стараўся ўявіць, як стаіць яна спуджаная нечакана прышоўшаю цемраю ночы на шырока раськінутых нагах і голасна рыкае, выцягваючы галаву, на кароткай сваёй шыі. Ад каровінага рыканьня ішло па лесе галасістае водгульле. Галынскі ўяўляў, што вось рыкнула карова і маўчыць, аблізваючы языком мясістыя свае ноздры, а водгульле яе голасу доўга

яшчэ жыве ў лясным гушчары, блукаючы ад палянкі да палянкі. Ад гэтага і ад дум нарастаў цяжкі смутак.

— Як-жа жывецца тут, панове, — запытаў Пілацеяў, зьвяртаючыся да каморнікаў.

— Нязвычайна добра, — адказаў старэйшы. — Жыцьцё тут нязвычайна добрае.

— Гэта правільна, — пасьпяшыў згадзіцца аграном.

— Гэта чыё-ж жыцьцё такое? — зусім нечакана для самога сябе кінуў словамі Галынскі і, улавіўшы ў словах злосьць, змоўк. Яму не хацелася ў гэты мамэнт спрэчак, бо адчуваў, што будзе ў спрэчках раздражлівы і злосны і таму застаўся задаволеным, калі на ягоныя словы ніхто не азваўся.

— Так, панове, жыць ня дрэнна, жыцьцё — рэч добрая. — Гэта гаварыў Пілацеяў. Ён сядзеў, як звычайна, адкінуўшыся да сьпінкі ў крэсьле, так менш прыкметнай была ягоная нізкарасласьць, і павольна гаварыў, трымаючы на стале руку з выцягнутымі на ўсю даўжыню пальцамі. — У сілу сваіх абавязкаў я вымушаны жыць у сталіцы, а я надзвычайна люблю вёску. Хочацца быць блізкім да зямлі. Мяне зямля лечыць. Вы разумееце, панове, зямля — гэта ўвасабленьне сілы і прастаты, добраці і спакою. Блізкасьць да зямлі робіць людзей добрымі і працавітымі, дадаў-бы яшчэ, робіць іх па-свойму мудрымі. Хіба няпраўда. — Ён дапытліва азірнуўся на прысутных.

Каморнікі нярухома сядзелі, услухоўваючыся ў кожнае яго слова, і старэйшы пахвілінна, ледзь не за кожным словам Пілацеява, згоднаківаў галавою. Аграном сядзеў, трымаючы ў пальцах відэлец, круціў яго, а Галынскі курыў і нэрвова барабаніў пальцамі па стале.

— Вялікая сіла ў зямлі, — гаварыў Пілацеяў, — а мы гэтага яшчэ да канца не зразумелі. У Расеі багатая зямля. У Расеі, панове, багата багатай зямлі...

— І на гэтай багатай зямлі ў Расеі багата галодных і беззямельных, — ня ўтрымаўся ад рэплікі Галынскі. — А рускія гарады кішаць безработнымі...

— Але, Міхаіл Палікарпавіч, гэта пакуль што няўхільна...

— Чаму няўхільна? Гэта было-б зразумела ў беднай бясплоднай краіне, але-ж гэта ўсё мае месца ў багацейшай Расеі, у Расеі з яе казачнымі багацьцямі. Бюракратыя руская задушыла ўсякую энэргію, усякую ініцыятыву, і халоднае, галоднае, сьляпое насельніцтва ходзіць па краіне, шукаючы работы, ходзіць па гэтых багацьцях..

Пілацеяў уважліва зірнуў на Галынскага, стараючыся разгадаць ягоную раздражлівасьць і заківаў галавою.

— Вы, Міхаіл Палікарпавіч, нешта ня ў гумары сёньня. Вы наўмысьля ня хочаце разумець самых простых рэчаў.

— Што-ж я, Феакціст Антонавіч, вельмі дрэнны палітык.

— Ну, гэта няпраўда.

— Чаму-ж няпраўда? Я зусім напрыклад не разумею, чым

жывуць, якімі ідэаламі жывуць сёньня палітыкі, пачынаючы ад самых крайніх соцыялістаў і канчаючы земцамі...

Гэта было ўжо зусім сьвядомым выпадкам супроць Пілацеява. Пілацеяў зразумеў гэта, але, каб не спрачацца, пастараўся загладзіць агульную зьбянтэжанасьць, пераверўшы гутарку на іншае.

— Міхаіл Палікарпавіч дабрэйшы чалавек, — сказаў ён, зьвяртаючыся да агранома. — Вялікі філантроп і палітык у больш шырокім сэнсе гэтага слова, чым мы. Палітычныя переконаньні Міхаіла Палікарпавіча можа быць менш практычныя, чым нашы, затое больш агульначалавечыя. — Па твары ў яго прабегла лёгкая, ледзь прыкметная ўсьмешка. Галынскі гэтую ўсьмешку адгадаў, але абмежаваўся тым, што падзякаваў Пілацеяву за тлумачэньне ягоных палітычных переконаньняў. А Пілацеяў тымчасам папрасіў прабачэньня і дазволу заняцца з каморнікамі некаторымі гаспадарчымі справамі. Галынскі падняўся, разьвітаўся і пашоў да сябе. Тады ўжо ў сьлед яму, зьвяртаючыся да агранома, Пілацеяў сказаў:

— Здольны, надзвычай здольны вучоны, а палітык блытаны, сам ня ведае, чаго хоча. Нейкая сіла супярэчнасьцей сядзіць у ім. Я ўсё-ж ня трачу надзеі, што ён будзе нашым. Гэта было-б надзвычай добра. У яго вялікі аўтарытэт.

Тымчасам, апынуўшыся ў сябе ў пакоі, Галынскі паспрабаваў разабрацца ўва ўсім, што цэлы дзень займала ягоныя мысьлі. Калі гаварыў, усё здавалася ясным, непахісна верным. Але варта было хоць каму запярэчыць яму, як зьнікала гэная непахіснасьць і тады з усёй сілай давала адчуць сябе адсутнасьць цьвёрдае глебы пад нагамі, таго, на што можна было-б абапёрціся. І вось гэтай апоры ня было. Разуменьні, якімі ён аргумэнтаваў свае мысьлі, былі пустымі, ня мелі канкрэтнага рэальнага зьместу. Ён стараўся напоўніць іх гэткім зьместам і, здавалася, што робіць гэта пасьпяхова. За словамі аб дэмакратыі паўставаў, хоць і смутны яшчэ, цень новай Расеі. Але прыходзіў выпадкова чалавек, народны вучыцель і пачынаў гаварыць пра зямлю. Тады цень новай Расеі, створаны ім у выабражэньні засланяўся жабрачымі постацямі галодных сялян. Постаці брылі адна за другой натоўпамі, і вобраз новай Расеі зьнікаў, расчыніўшыся ў струмені галодных людзей, а ён адзін бездапаможны стаяў у баку, ня ўмеючы памагчы гэтым галодным, ня ўмеючы захаваць у памяці вобраза, які стварыў для сябе і Расеі. Так было і на гэты раз. Стомлены гэтымі мысьлямі ён распрануўся і лёг, каб хутчэй заснуць. І тады ўзбрылі на памяць, абудзіўшы ўсьмешку, радкі з верша:

„Как дивно солнце ни свети,
А всё-ж оно должно зайти."

А за гэтым прыйшоў сон.

Платон Галавач

З роднае Сакольшчыны

Хацеў-бы з нагоды кніжкі інж. *Крыштофіка*)* зьвярнуць увагу беларускага грамадзянства на *Сакольшчыну*. Трэба сказаць з сумам, што розныякія ўмовы і абставіны апошніх некалькінаццаці гадоў быццам пакінулі Сакольшчыну, Аўгустоўшчыну, ды адчасьці Беласточчыну за лагвом нашага нацыянальнага жыцьця і змаганьня. Сяньня шмат хто, на'т і з перадавое інтэлігенцыі, заглядаецца на менаваныя тэрыторыі, як на мёртвую пазыцыю нашага нацыянальнага чалавечага, інтэлектуальнага і гаспадарчага білянсу, калі яны якга павінны быць дзейным жывым капіталам.

Да вайны бачылі мы ў Сакольшчыне адныя з першых спробаў масавае акцыі нацыянальнае сярод сялянства. Ці гэта былі паасобныя выезды сяброў Горадзенскага гуртка моладзі на вёску з мэтаю распаўсюджваньня сьведамасьці, ці гэта былі выезды тэатральнае трупы вышменаванае арганізацыі — усё гэта будзіла і клікала народ да новых, лепшых дзён і Сакольшчына шырока адгукнулася. З Сакольшчыны родам, сяньня забыты, хаця жывы яшчэ, аўтар сапраўды філёзофічнае, адначасна вельмі простае і практычнае кніжкі пчалярскае, вядомы пад мянюшкаю *Г. Бярозкі* (Кс. Г. Бэтто). Згэтуль родам *Кс. Фр. Грынкевіч* — пачынальнік вельмі навачасна наладжанае працы паміж моладзьдзю. Сярод Сакольцаў бачым перадавую жанчыну ў нашым грамадзянстве *Л. Войцічыху* ды шмат, шмат яшчэ іншых людзей...

Вайна перабазавала пункты апоры працы беларускае на новых мясцох і Сакольшчына заглохла, казаў-бы нехта—дзірваном парасла. Зрух у пару Грамады скрануў быццам часткова і расьцярушыў нейкую дрымоту. Аднак не надоўга. Глядзельнік сяньня звонку ня бачыць тае руні беларускае, якая буйна паўсходзіла пару дзесяткаў гадоў таму назад.

Аднак і пасьля вайны вёска ў Сакольшчыне змагаецца за свае правы, імкнецца да асьветы ў роднай мове, робіць спробы наладзіць свае школы. Паказальнікам сьведамасьці можа быць адчасьці распаўсюджаньне прэсы. Дзеля арыентацыі зьвярну ўвагу на такі мамэнт, што ў аднэй з валасьцяў на пошту прыходзіла каля 50 экзэмпляраў прэсы палітычнае розных напрамкаў, органаў гаспадарчых і г. д. Колькасьць, бяручы яе ў самой сабе, мо' і невялікая, аднак для нашых умоваў яна многагаворачая. Пасьля ведамае, няслаўнае забароны арцыб. Ялбжыкоўскага, колькасьць чытачоў меншае да 10 прац. Не напалохаліся ксяндзоўскіх праклёнаў толькі праваслаўныя. Усё-ж і на іх знайшліся спосабы, і сяньня беларускі друк рэгулярны ў Сакольшчыне справа ня лішне частая.

*) Inż. Krystofik „Jasienówka—wieś powiatu Sokolskiego". Poznań 1934.

Беларуская арганізаваная работа ідзе там і сяньня, толькі мае йнакшы характар, інакшую тактыку, чымся ў другіх раёнах. Дзеля гэтага і наш падыход і адносіны да людзей і тэрыторыі мусяць быць іншыя. Першым крокам да таго — ведаць народ, ведаць псыхолёгію мясцовую. Сакольшчыну сяньня трэба нам вывучыць, ня трэба аб ёй забывацца.

* * *

Монографія Крыштофіка цікуе аб адной толькі вёсцы, да таго-ж з захадняе часткі павету Сакольскага. Аўтар маніцца прадставіць толькі зямельную праблему ў гістарычным аспэкце, аднак сабраў столькі цікавага матарыялу гістарычнага, эканамічнага, соцыяльнага, бытавога на шырокай асноведзі псыхолёгічнай, што гэта дае нам магчымасьць пазнаёміцца ня толькі з аднэю вёскаю, а з цэласьцю гэнае тэрыторыі.

Насельніцтва тутака мае шмат асаблівасьцяў. Да XIV стагодзьдзя зямля тутака заселена Яцьвягамі. Толькі пад канец XIV ст. прыходзяць каляністыя і, наколькі можна судзіць з прозьвішчаў, каляністыя ідуць з усходу. Гэта тэрыторыя экспансіі беларускае. Прозьвішчы сучасныя Клімушко, Церэшко, Аўсейко, Карпеня, Сапко, Кулак, Крагель, Андрэйчык і г. д. паказываюць на чыста беларускае іх паходжаньне. Прозьвішчы такія, як Ровдэлі, Жымелі, Шыпіто, Сампляс, Кімшало, Шаргяло і г. д. — што шмат іншае крыві — яцьвяскае ды літоўскае — ўлілося і зьмяшалася са славянскаю—беларускаю. Ёсьць магчыма і сьляды татараў. Родная мова насельніцтва, як аўтар лёяльна пацьвярджае, — беларуская. Мова ваколіцаў Ясяноўкі крыху мягчэйшая. Найбольш ярка бачым гэта ў такіх формах, як „сьмяецьця"... бярэцьця" і т. п. Веравызнаньне мяшанае, з большасьцю каталікоў. Суадносіны паміж вернікамі розных веравызнаньняў добрыя, ня гледзячы на ўсякія падзеі ў мінуўшчыне ды сучаснасьці. Яшчэ дасюль прымета канфэсыйная: „вера руская і польская" — зьяўляюцца лініяю падзелу ў шмат якіх галінах грамадзкага жыцьця.

Ясяноўка — характэрны прыклад долі ці лепш нядолі нашага народу. У XVII ст. жыло ў вёсцы 31 сем'яў—каля 255 душ. У XVIII ст. было толькі каля 90 жыхароў. З раней асеўшых людзей мала хто астаўся, сустракаем у сьпісках усё новыя прозьвішчы. Розныя войны дзяржаўныя і „няціхоты" хатнія паміж панамі, розныя пошасьці пакідалі парожнія вёскі, а народ нейдзе прападаў. Сьлед пасьля такіх войнаў быў заўсёды пэўны адзін, што работа на землях каралеўскіх ці панскіх аставалася меншай колькасьці людзей. Галіта прыганятых, культурная адсталасьць— гэта прыметы, без якіх ня можна сабе ўявіць колішняга селяніна беларускага.

Не ўваходзячы ў прычыны, якія выклікалі акт 1861 г., канец паншчыны быў і ў Ясяноўцы пачаткам новае пары. Яшчэ ў 1823 г. на 30 хатаў у вёсцы ў 14-ці жыло больш чымся 5 асо-

баў, а ў пяці хатах больш чымся 9 людзей. Яшчэ ў 1862 г. толькі дзьве жанчыны маюць больш чымся 60 гадоў, няма ніводнае старэйшае за 70 гадоў. Хаты найчасьцей курныя, халодныя. З лесам у Сакольшчыне скупа ўжо ў пачатку XIX ст. З канцом прыгону—можна сказаць яркая перамена ўва ўсіх галінах жыцьця. Праўда, за апошніх 40 гадоў мала павялічыўся лік насельніцтва ў вёсцы. Шмат народу йшло ў Амэрыку на эміграцыю. Эміграцыя з Сакольшчыны тым вызначалася, што вялікі працэнт эмігрантаў аставаўся назаўсёды ў чужой старане, з прычыны перанаселенасьці свае тэрыторыі. Сяньня на 1 кв. клм. жыве тутака 54 людзей, а сярэдне на адзінку выходзіць 1,85 гэктара зямлі. Пры ніжэй сярэдняй якасьці зямлі, пры ніскай культуры земляробскай цяжка жыць. Эміграцыя не парывае лучнасьці са сваімі. Эмігранты сваім капіталам, ці лепш казаць, апошнімі грашамі, зробленымі на амэрыканскіх фабрыках, спрычыняюцца да амаль поўнае ліквідацыі буйнае ўласнасьці ў Сакольшчыне. Сяньня, можна казаць, панскіх двароў амаль што зусім няма ў Сакольшчыне.

Асьветы публічнае ў раёне Ясяноўкі да канца XIX ст. ня было. Нармальную школьную акцыю бачым пачынаючы толькі з 1900 г. Да вайны дзяўчат у школу хадзіла вельмі мала. Хлапцы, і тыя, лучалі найчасьцей у паваротны анальфабэтызм. Прыватныя „школы“ былі лепш наладжаны. Патрэба ўмець маліцца з кніжкі (папольску) вяла да таго, што кожная вёска мела свайго „дарэктара“, які вучыў дзяцей. Дырэктарам быў найчасьцей пастыр, які ўлетку ў той самай вёсцы гнаў авечкі ў поле. Ад пары да пары дырэктарам быў чалавек бывалы па сьвеце. Абойм навукі ў такіх прыватных школах быў абмяжованы і вуска „спэцыяльны“. Найчасьцей вучань умеў чытаць выключна на сваёй кніжцы да набажэнства. Школьны прымус пасьляваенны паправіў сытуацыю. Сяньня Ясяноўка мае 35,3 прац. анальфабэтаў. Асьвета публічная пасьляваенная даволі аднабокая. Хопіць сказаць, што ў павеце няма ніводнае сельска-гаспадарчае школы, няма школы гандлёвае, няма ўмоваў да таго, каб моладзь магла знайсьці выхад з вёскі. Эміграцыі пасьля вайны няма. Пры комасацыі ўжо зробленай, ці якая сяньня рэалізуецца, няма ніякае гутаркі аб надзеле зямлёю. Няма скуль яе ўзяць. Пэрспэктывы эканамічныя вёскі на будучыню вельмі цяжкія. Перанаселенасьць кліча аб патрэбе шырокіх плянаў і неадкладнае іх рэалізацыі.

Сьведамасьці нацыянальнае беларускае масамае няма. Няма затое ніякае іншае. Няма, можна казаць, і сьведамасьці палітычнае. Ясяноўка, як і ўся Сакольшчына, жджэ, быццам тая зачараваная каралеўна, свае пары і таго слова, якое скране да поўнага жыцьця. Дагэтуль народ жыве з дня на дзень, цікуючы аб вельмі дробных праблемах, ня выходзячы за межы свае вёскі ці парафіі. Народ ня верыць у свае сілы, глядзіць з недаверам на ўсё навакольнае. Змаганьне палітычных партыяў польскіх ня

выклікае рэха. У найбольш гарачую пару калатні соймавых партыяў людзі кінуўшы картачку на адзін са шматлікіх нумароў больш ня цікавіліся, каго выбралі, які лёс сабе яны нарыхтавалі.

Дзівіцца ня будзем з такіх адносінаў. Народ вякамі стагнаўшы ў паняволеньні, прыгоне не паражыў патрэбнага ўздойму пачуцьцёвага, не ўяўляе рэальнасьці сучаснага палітычнага ладу. Аб адносінах да ўлады, аўтар гаворыць даслоўна: „могуць уладзе падпарадкавацца ці проці яе бунтавацца, не разумеюць яе“... (бачына 203).

З дзейнікаў, якія беспасярэдне ўплываюць на перамену такога становішча, аўтар спыняецца над школаю, асьветаю зашкольнаю і прэсаю. Нічога ня кажа аб адным яшчэ магутным дзейніку — касьцёле і царкве. Агулам, аўтар не дацэнівае ролі гэных конфэсыйных установаў. Мы мусім сказаць, што шлях нармальнага разьвіцьця ўсіх чатырох дзейнікаў працуе на першы пагляд проці нас. Будучыня пакажа, наколькі мы будзем жывучы ці на колькі зможам процістаўіцца ў плошчы канкрэтнае саліднае работы культурна-асьветнае.

Народ у Ясяноўцы вельмі ашчадны. Ашчаднасьць між іншым праяўляецца ў шмат якіх хатніх абычаях, вопратцы, ежы і г. д. Церазпалосіца ад вякоў прымушае да канкрэтнага ладу жыцьцёвага. Аснаўным пасілкаваньнем будзе не абед, як гэта прынята ўсюды, а сьнеданьне. На абед было-б лішне далёка варочацца з поля да хаты, часта за 4—5 клм., дык гаспадыня варыць адзін раз раніцаю, а палуднуюць у полі. Лета — гэта аснаўны сэзон, сьляды якога наглядаем у агульным ладзе хатнім і гаспадарчым.

Ашчаднасьць дрэва, форма печак — вось яшчэ прычыны такога, а ня іншага ладу. Кухня вельмі скромная іаднабокая. Стравы мала мяняюцца ў розных сэзонах. Кухня багатых гаспадароў (багатым завецца ўласьнік 8—12 гэктараў) аднолькавая з суседзямі бяднейшымі.

Форма гаспадаркі прымітыўная. Можна казаць, што лад заведзены валочнаю ўстановаю з 1557 г. датрываў да нашых дзён. Сучасная комасацыя заводзіць новы лад, які ў шмат у чым розьніцца на лепшае ад таго, што было дагэтуль. Сяньняшні гаспадар розьніцца ад свайго прадзеда, што не гарэ валамі ды сахою, а карыстаецца плугам ды канём, што мае спранжыноўку замест ці побач дзераўлянае бараны ды мо' яшчэ тым, што сее лубін і сэрадэлю. Ясна, што і гэта поступ, толькі што як трохпалёўка заядала 100 і 200 гадоў, гэтак заядае яна і сяньня. Сыстэма гэная раўняла гледзячы на горшых і на горшае, а не на лепшых.

Рабочую вопратку шыюць з самадзелу. Сьвятам маладое пакаленьне апранаецца ў фабрычныя „гарнітары“. Хусьця нацельнае і пасьцельнае сваё кужэльнае. Зьверхняя цёплая вопратка саматканая, са свае воўны, а кажухі са сваіх авечак.

Адным з характэрных рысаў у людзей, паводле аўтара, што быццам кідаецца ў вочы, — гэта малы культ традыцыі, нахіл прымаць усё чужое. Гэная свомасьць праяўляецца ў мове, абычаях, вопратцы ды агулам усюды. Гэтым аўтар хоча паясьніць, чаму Сакольшчына бедная песьнямі. Чужое, хай мала зразумелае, трымаецца, паводле яго, вельмі моцна, яно, думаюць, нейкае лепшае. Побач слоў выказываючых такі пагляд, гаворыць зараз далей, што ў важнейшых мамэнтах — вясельле, хрэсьбіны, памінкі і г. д. — толькі старадаўнія песьні здаволіваюць пачуцьцёвыя патрэбы народу. Новыя ні зьместам, ні рытмам, ні агульным характарам ня могуць знайсьці тых нясьведамых, таёмных шляхоў, што адчыняюць душу і сэрца чалавека.

Лішне мала складаным прыдаецца аўтару характар людзей, калі ён робіць вывад з міралюбівасьці, лагоднасьці аб безхарактарнасьці. Аб прысутнасьці характару гаворыць вельмі красамоўна тое, што гэны народ астаецца верным сабе. Часта гэнае „сваё" яшчэ нявыяўлена, яшчэ не пераж ыта, агульна аднак стаіць на старожы якга ўсіх найважнейшых традыцыяў. Прысутнасьцю гэнага „нечага" можа паясьніць і „апалітычнасьць" і „грамадзкасьць" і тыя абыякавыя пагляды на навакольнае жыцьцё.

Аўтар гаворыць, што Ясяноўчане не салідарныя, што любяць яны пасьмяяцца адны з адных і г. д. Паклікаецца тутака на рознае этнічнае паходжаньне жыхараў, а адсюль ідзе нейкая расавая варожасьць.

Асабіста ведаю добра іншыя раёны Сакольшчыны, з тым самым складам насельніцтва, што ў Ясяноўцы. Ня мог бы дзеля гэтага падзяліцца з Крыштофікам, каб этнічна розныя элемэнты былі дасюль нечым характэрным для Сакольшчыны. Суседзкія спрэчкі, калатні, часамі суды — гэта выплад абставінаў, у першую чаргу гаспадарчых, між іншым тае самае няшчаснае цераспалосіцы, якая мо' больш як дзе нязносная. Вёскі скамасаваныя, дзе такім чынам „высахлі" крыніцы спрэчак,—доказам добрых суседзкіх суадносінаў.

* * *

Спыніўся я над некаторымі праблемамі з кніжкі інж. Крыштофіка. Як казаў я вышэй, аўтар цікаваў прадусім аб праблеме зямельнай і ў першай чарзе аб комасацыі і ейных сьледамках на зямлі і гаспадарцы. Сам Крыштофік сын вёскі, аб якой піша. Трэба сказаць, што найчасьцей добра ён яе разумее і хаця ўважае сябе за Паляка ўмее шчыра і аб'ектыўна расказаць усё аб сваёй старане ад самае далёкае мінуўшчыны, наколькі дазваляе на гэта гістарычны матарыял. За праф. Шраммам, у якога пісаў сваю працу інж. Крыштофік, трэба згадзіцца, што асабліва беларусам пры складзе нашае нацыянальнае гаспадаркі зьяўляецца небходнасьцю разбудова новае галіны — *соцыёлёгіі сельскае гаспадаркі.* А мы нажаль так вельмі мала ведаем аб сабе.

Др. Ст. Грынкевіч.

У Панарах

Недзе плачуць калёсы за бродам,
нізка зьвіс неба сіні дыван;
праз імглу, на агонь мой, з усходу,
цяжка зморany йдзе караван.

— Гэй, адкуль, — мо' з далёкага краю,
дзе прастор стэпаў ў сонцы гарыць?!—
Драмадэры нагамі ўзрываюць
ціха жвір падарожнай зары.

І мінаюць оазы сівыя —
каб шлях зорны з вачэй ня згубіць.
І ў даль цягнуцца доўгія шыі,
і калышуцца ветрам гарбы...

— Гэй, за вамі ўжо шлях залаціцца...
ня мінуць вам, да сонца, граніц
беларускіх зямель і крыніцаў!
Ці-ж ня лепш затрымацца, спачыць?..—

Паднялася імгла белай хмарай...
Не вярблюдаў ў далі караван,
а ланцуг ўсхваляваных Панараў
і лясоў залаціцца дыван.
1937.

Максім Танк

На далёкіх курганох

Зорныя сыгналы —
яркія агні —
недзе заігралі
ў сіняй шырыні.

Нехта выліў звонка
песьню на траву —
там сасна з сасонкай
хіляць галаву.

І на тых курганах
будуць кветкі ныць,
будуць кожны ранак
гнуцца палыны.

Хіба сонца з косаў
вытча палатно —
на зялёных росах
гурбу дываноў.

Ды на родных гонях
зашуміць быльлё,
ў шэрым перазвоне,
што за волю лёг.

Анатоль Івэрс

МІКАЛАЙ РЭРЫХ

Сёлета восеньню ўвесь міжнародны культурны сьвет сьвяткаваў 50-лецьце мастацкае працы Мікалая Канстантынавіча Рэрыха, дзеяча зусім надзвычайнага, — сусьветнага маштабу і размаху. Лічым небезкарысным пазнаёміць нашых чытачоў з гэтай запраўды-ж задзіўляючай, блізу легендарнай ужо за жыцьця асабістасьцю, тымбольш, што некаторымі рысамі сваей дзейнасьці слаўны расейскі, а цяпер міжнародны мастак, датыкаў краіны, жыцьця і душы нашага беларускага народу.

Змалку Рэрых праводзіў вакацыі ў бацькавым маёнтку ў Пецярбурскай губэрні і на ўсё жыцьцё палюбіў сумную, але магутную прыроду паўночнай краіны, якая так падобная да нашай беларускай прыроды. Тут мастак на ўсё жыцьцё атрымаў у дар ад маткі-прыроды тую „цягу зямную", тую неразрыўную сувязь з зямлёю, без якое наагул няма мастака, няма наагул запраўднага тварца, дзеяча на зямлі, дый якая так цесна радніць мастака з душою беларускага хлебароба. Гэтая, змалку пакаханая, паўночная прырода і зрабіла з Рэрыха таго мастака *паўночнага краявіду*, які здабыў сабе першае прызнаньне, а неўзабаве і славу ўва ўсім сьвеце.

Далейшы ход разьвіцьця мастака таксама страшэнна цікавы для беларускай сьведамасьці. Малады мастак вучыцца ў Пецярбурскай Акадэміі Мастацтва, запаляецца палкай любоўю да *роднай мінуўшчыны*, якая была ў расейскім сьвеце наагул у паняверцы. Тэмы роднай мінуўшчыны цалком захопліваюць мастака. Ён робіцца архэолёгам, гісторыкам, вывучае летапісы, архівы, разрывае курганы, зарываецца ў нетры роднай зямлі, стараючыся з усяго гэтага матарыялу, гэтых абрыўкаў і абломкаў мінулага, ад веку памёршага жыцьця — ўскрасіць яго йзноў, вярнуць да жыцьця, адтварыць яго красу ў сваім мастацтве.

І гэтая *творчая любоў да роднай зямлі і яе мінуўшчыны* зрабіла запраўднае чуда ўскрашэньня памёршага жыцьця. Мастак творыць цэлы рад вялікіх абразоў, ускрашаючых гэтую быццам памёршую мінуўшчыну да новага жыцьця— у *новай вопратцы, пераабражанай мастацкай красой, прыбранай кветкай легенды*.

Праз гэтыя абразы, створаныя геніем і любоўю мастака, ускрошаная мінуўшчына рабілася *жывою сілай, якая ўладна ўваходзіла ў сьведамасьць грамадзтва і народу, робячы з іх адзіны, суцэльны, зьвязаны ня толькі ў прасторы, але і ў часе—арганізм нацыі*... Хто-ж з беларусаў ня чуе, як патрэбна такое-ж мастацтва і для нашага народу. Ёсьць, праўда, і ў нас, але-ж толькі зачаткі, яшчэ вельмі слабыя, такога чудатворнага мастацтва, маючага ад Бога і прыроды ўладу і сілы вызваляць ад сьмерці, вяртаць да жыцьця нашую мінуўшчыну, якая—няпраўда, што быццам памёрла: яна толькі сьпіць, дый сьпіць, зусім жывая, як князёўна у байцы — *у нас самых, у нацыянальнай душы народу, у творстве яго мастакоў, паэтаў, пісьменьнікаў, дый можа прач-*

нуцца ў кожны мамэнт да новага жыцьця, каб ізноў новымі сіламі прошлага тварыць і сучаснасьць і будучыну народу і яго краіны....

Ня будзем тутака пералічаць гэтых цыкляў абразоў Рэрыха, даўшых яму славу — ня толькі ў Расеі, але і далёка за яе рубяжамі. Адзначым толькі, ізноў для беларускага чытача спэцыяльна, што тое мінулае жыцьцё, якое ўваскрашаў і адтвараў у сваім мастацтве Рэрых, было зусім ня выключна расейскае, не — яно было ўзначнай меры *агульна-славянскае,* прынамсі — *усходня-славянскае.* Такім чынам, і ў мінуўшчыне гэтай творства Рэрыха закранала беларускі сьвет.

Трэба цяпер асабліва падчыркнуць тую галоўную рысу, якая адзначала творства Рэрыха ў галіне яго *гістарычнай жывапісі.*

Гэтая асаблівая рыса — *позытыўны, багаслаўляючы, узьвялічваючы характар творчага падыходу мастака да адтворанага ім жыцьця, які імкнецца падчыркнуць і адтварыць абсалютную, нясумніўную самацэннасьць гэтага жыцьця, яго „сьвяшчэнную паважнасьць",* паводле слоў Гётэ.

Зразумела, што ў гэтым узьвялічэньні, павышэньні жыцьця — наагул задача запраўднага мастацтва, якая радніць яго з *рэлігіяй.* Бо-ж якраз гэтае мэтафізычнае падвышэньне, усіленьне і ўзьвялічэньне ўсіх функцыяў нашай разумнай сьведамасьці, нашай душы — праз зблізэньне яе з надпрыродным зарубежным сьветам — складае асноўную псыхолёгічную ці пэдагогічную задачу рэлігіі, як гэта высьвятліў нямецкі філёзаф Віндэльбанд.

І вось, у Рэрыха гэтае „узьвялічэньне" адтваранай ім у мастацтве прыроды, гэтая яго „сьвятарная павага," гэты яго быццам жрэчэскі падыход да сваіх мастацкіх тэмаў — маюць асабліва „рэлігійны" характар. Дзеля таго яго абразы маюць такую запраўды-ж „сьвяточную" вопратку, такі быццам — „богаслужэбны" характар. Лёгка зразумець, якое вялізарнае *ўзгадаваўчае наагул, асабліва-ж нацыянальна-узгадаваўчае значэньне мае гэтае творства вялікага славянскага мастака,* дый — як такое мастацтва патрэбна і нам, беларусам...

У сувязі з гэтай аснаўной рысай рэрыхаўскага мастацтва вельмі цікаўна прывесьці пару-другую думак мастака з галіны *тэорыі* ці *ідэолёгіі мастацтва,* бо-ж трэба ведаць, што Рэрых быў ня толькі мастак пэндзля, але вельмі сільны, орыгінальны і глыбокі мастак пяра, а цяпер, як даведаемся больш падробна далей, ён стаў адным з самых орыгінальных мысьліцеляў сьвету, прызнаным духоўным правадыром сярод найбольш культурных, асабліва — англа-саскіх народаў сьвету.

— Крыніца творства, піша Рэрых, гэта ёсьць *сэрца.* Сэрца ёсьць сонца ў чалавеку, як сонца ёсьць сэрца сусьвету. І вось якраз роля сэрца ў нас так страшэнна прыніжана, падрэзана нажом аналізуючай навукі. Трэба, каб сэрца творчай любоўю сцаляла тое, што парэзала — дзеля веды — навука. Зтуль плыве творства.— Дух чалавечы шукае яркіх каляровых вопратак,

бо-ж гэтыя „колеры рэчаў памагаюць нашай духовай вопратцы запаліцца ярчэйшым сьвятлом.“ Мастацтва вядзе нас на *„сьвята пашыранай сьведамасьці,“* бо-ж якраз у стане гэтай пашыранай сьведамасьці — натхненьня — творыць мастак свае творы...

26.XI.37. на сьвяткаваньні угодкаў „польска-беларускага“ паэта Сыракомлі шырака ведамы і беларусам, праф. М. Зьдзяхоўскі, дасканалы знаўца сусьветнай, ясна-ж, і польскай літаратуры, паўтарыў сваю лекцыю аб гэтым паэце. Праф. Зьдзяхоўскі, першы з польскіх крытыкаў, угледзіў вялікія вартасьці ў паэзіі Сыракомлі, адзначыўшы ў ім яго *беларускую душу, незразумелую для душы польскай.* Незразумелая яна таму, што *яна сумная,* як сумны і краявід беларускай прыроды. Гадоў больш дзесяці таму, праф. Зьдзяхоўскі выпусьціў сваю першую лекцыю аб Сыракомлі ў асобнай кніжцы. На апошнюю адазваўся адзін з беларускіх крытыкаў, Суліма, які далікатна закінуў паважанаму аўтару, што ён лічыць ня толькі мастацка-пекным, але і ў некаторай меры „нармальным“ гэты глыбокі сум у беларускай душы. . Крытык Суліма даводзіў, што сум наагул атручвае душу, забівае яе творчыя сілы, а ў кожным разе зьяўляецца адбіцьцём *ненармальных варункаў жыцьця народу, з якога выходзіць такі наскрозь сумны паэт...*

Дык трэба ставіць усю справу і глыбей і шырэй, не „статычна“ і эстэтычна, захопліваючыся „красой выражэньня гэтага суму,“але — *дынамічна, грамадзка, нацыянальна — як праблему пературэньня тых варункаў народнага жыцьця, якія атручвалі вякамі гэтым сумам жывую творчую душу народу...*

Успамінаем аб гэтым нашым „нацыянальным суме“ у зьвязку з тым магутным „тонусам“ сьветлай, бадзёрай радасьці і сілы, які разьліты ў мастацкім творстве Рэрыха — нават у яго адтварэньні краявідаў яшчэ больш сумнай і прыгнятаючай паўночнай прыроды. Рэрых запраўды-ж як быццам пацьвярджае тэзы крытыка Сулімы, які трэбаваў, каб той „дух“, які прыходзіць на помач душы народу, паняволенай сумам роднай прыроды, меў сілу *перамагаць гэты сум, зьністажаць яго атруту, ператвараць яго ў радасьць перамогі і вызваленьня з „паншчыны прыроды,“* да якой заўсёды далучаецца, як ведама, і паншчына соцыяльная... Мастацтва Рэрыха — запраўды-ж найлепшая школа для нашых мастакоў, якія павінны, праўдзіва адтвараючы нашу родную прыроду, *не паддавацца суму, але якраз сваім мастацтвам ператвараць яго ў радасьць мастацкай перамогі,* — як гэта патрапіў рабіць Рэрых...

* * *

Другі мамэнт сутычнасьці Рэрыха з беларускім сьветам, які трэба адзначыць нам тутака, датычыць яго працы ў слаўнай у свой час — ня толькі на ўсю Смаленшчыну, але і на ўсю Эўропу — *школе народнага мастацтва ў Талашкіне.* Што-ж гэта Та-

лашкінская школа? Талашкіна—маёнтак княгіні Тэнішавай, у якім яна залажыла і ўтрымлівала гэную школу. Школа мела задань-нем, злучыўшы творства народных мастакоў у галіне рознага роду „кустарнай“ прамысловасьці, ці народнага вырабніцтва з творствам найлепшых мастакоў расейскага культурнага сьвету, *паднязь творчую працу народу ў гэтай галіне на вышэйшы ровень— запраўднага прыкладнага мастацтва.*

Рэрых пламенна запаліўся думкай кн. Тэнішавай і шмат папрацаваў у яе школе, у якой вучыў сялянскіх хлапцоў і дзяўчат, рысаваў і маляваў для іх найлепшыя узоры тканін, вышывак, модэлі мэбляў і розных іншых рэчаў дамовага прыбору і ўжытку, укладаючы ў іх мастацкую красу. Гэтая праца добра адказывала яго ўласнай думцы аб тым, што *жыцьцё трэба рабіць харошым — ня толькі ўнутраным зьместам, але і вонкавай формай.* Разам з Рэрыхам у школе Тэнішавай працавалі найвыдатнейшыя мастакі, паміж іншымі і наш віленчук—Бакст, што выводзіцца з тутэйшай купецкай сям‘і.

Ажыўляючая гэную дружную сям‘ю творчая ідэя — *злучэньня дзеля супольнага творства сялянскай „землянай сілы“ і высокай меставай культуры,* каб разам супольнымі сіламі тварыць *нацыянальную красу і сілу* — была вельмі блізкай Рэрыху, які, як сказана вышэй, ніколі не адрываўся ад *зямлі і ад яе найбліжэйшага да зямлі социяльнага слою — земляроба...*

* * *

Трэці раз сутыкнуўся Рэрых з беларускім сьветам у 1904 г. у часе свайго грандыёзнага аб‘езду ўсіх галоўных архітэктурных цэнтраў тадышняй Расеі. З гэтага аб‘езду Рэрых вывез вялізарную масу „архітэктурных нарысаў,“ зарысовак — пераважна з галіны монумэнтальнага будаўніцтва — царкоўнага і палацовага. Быў ён тады, зразумела, і на беларускай зямлі, і ў беларуска-літоўскіх местах, быў у Вільні, Троках, Горадні, Коўне, Магілеве і інш., адкуль вывез шмат этюдаў. Цяжка пералічыць, колькі „адкрыцьцяў“ для расейскага мастацкага сьвету зрабіў тутака Рэрых, падгледзіўшы сваім вострым зрокам і схапіўшы быстрай рукой мастака несьмяротную красу гэтага будаўніцтва на нашых землях.

* * *

Трэба адзначыць яшчэ раз сутычнасьць творства Рэрыха з беларускім сьветам,—гэта ў яго пазьнейшых абразох, у якіх ён ізноў вяртаецца *да працы земляроба — да сялянства.*

Прадчуваючы ўжо вайну, рэвалюцыю і развал сваей роднай Бацькаўшчыны, чаго мастак даў нязвычайна яркія довады ў сваіх прароча-сымбалічных абразох, Рэрых — таксама прароча, як Лявон Талстой — зьвяртаецца, каб абапёрціся духам і верай, — *да тых аснаўных элемэнтаў і вартасьцяў на зямлі, якіх ня мо-*

жа зьніштожыць, ні „перавярнуць“ ніякі пераварот, ніякая рэвалюцыя — да селяніна-хрысьціяніна і яго сьвятой працы на зямлі. Тут, перажыўшы ў нетрах свайго прароча-творчага духу глыбокі крызыс, мастак знаходзіць як-быццам *найбольш моцную і трывалую сынтэзу неба і зямлі, неперыможную ні для якой руйнуючай сілы ўва ўсім сьвеце.* Стуль — цэлы рад абразоў, узьвялічываючых рэлігійнай верай гэтую, так сказаць, *вечную „богохранимость“ на зямлі працуючага земляроба..* На гэтых, запраўды-ж цудоўных па сваей сьветлай, залатой сьвяточнасьці, абразох мастак адтварае гэты вечны, ідэальны сьвет сялянскай працы на ральлі, у якой чыннае ўчасьце прымаюць... і хрысьціянскія сьвятыя, а нават сам Бог, і Хрыстос, і Божая Матка... На абразе „Тры Радасьці,“ прыкладам, — у цэнтры шчасьлівы гаспадар-селянін, з яго дваром, а наваколл — на нівах і па лугох— сьв. Ільля зажынае жыта, сьв. Мікола пасе кароў, сьв. Юры сьцеражэ коні... Увесь абраз быццам заліты „залатой ласкаю Божаю“, як у царкве, ці ў касьцеле, якая ліецца з неба, з сонца на густое, цяжкае, ядраное жыта, на статкі, што пасуцца нававакол, на лугі і нівы, што раськінуліся па ўзгорчатых прасторах наўкруг двара. Краявід блізу цалком беларускі... Мала таго: *беларускім зьяўляецца тут і ўнутраны зьмест абраза, бо-ж ён ёсьць якбыццам адбіцьцём адвечнай „рэальнай, працоўнай рэлігіі“ нашага беларускага хлебароба, які таксама — ў сваіх калядках і шчадроўках „змушае“ ўсіх сьвятых, ня выключаючы і самога Хрыста з яго сьвятою Маткай, працаваць з потам на чале, памагаючы яму ў яго цяжкай працы на зямлі...*

Але, жывапісуючы ярка і глыбака гэтыя „трыумфуючыя сугуччы“ зямлі і неба, усю гэтую „нярукатворную красу“ адвечнага сялянска-славянскага ідэалу, Рэрых не абмежыўся — у сваім сьветапачуцьці — толькі адным бокам—оптымістычнай сьвятарнасьці. Не, яго гэны рэлігійны оптымізм, як сказана, — глыбока-выстраданы, а таму зусім ня робіць уражаньня плыткасьці і лёгкасьці „мастацкага казаньня.“ Довадам гэтага доўгі рад абразоў, у якіх мастак няменш глыбака і ярка адмаляваў другі адваротны бок адвечнай веры славянскай душы: цёмны, жудасны „сьвет цемры,“ які выпаўняе гэтую душу жахамі перад няпераможанымі яшчэ для яе, злымі сіламі славянскай прыроды і сялянскай грамадзкай стыхіі, варожымі да жыцьця, працы і шчасьця чалавека... І тут ізноў — згадзіўляючая блізкасьць да нашага беларускага, нажаль, больш, як толькі казачнага сьвету. Даволі успомніць хаця-б цэлы аддзел у паэтыцкіх творах нашай паэткі Натальлі Арсеньневай, пад загалоўкам „Зачараваны Кут“... Гэная сэрыя абразоў Рэрыха якбыццам дасканальна дапасаваная ілюстрацыя да гэтых твораў Арсеньневай...

—о—

Мы зрабілі вышэй кароткі перагляд усіх тых „стыкаў,“ якія лучылі творства аднаго з найвялікшых расейскіх мастакоў з нашым беларускім сьветам.

На заканчэньне, каб паказаць нашым чытачом, з кім яны тутака мелі да чыненьне, якога маштабу ды размаху — ня толькі мастак, але *чалавек,* стаіць перад імі ў нашым слабым адлюстраваньні, дамо яшчэ кароткі нарыс таго, што зроблена Рэрыхам — пасьля таго, як ён, з болем і сумам пакінуўшы родную Бацькаўшчыну, выехаў на чужыну.

Праз Азію Рэрых едзе ў Амэрыку, якая ўжо поўна была яго славай. У 1921 г. ён закладае ў Нью-Іорку „Міжнародны Мастацкі Цэнтр" — (*Corona Mundi*), у 1922 г. асновывае там-жа свой знамяніты цяпер „Інстытут Злучаных Мастацтваў" з „Музэям Рэрыха." Наколькі даверу ды энтузыязму выклікае ў Амэрыцы імя Рэрыха, відаць з таго, што, прыкладам, Інстытут і Музэй Рэрыха, які ў 1922 г. мясьціўся ў адным пакоі, *свае дзесятыя ўгодкі сьвяткаваў ужо ў уласным „небаскробе" — у дваццаць дзевяць паверхаў*... У музэі сабраны мастацкія творы *усіх народаў сьвету, а ў першую чаргу, зразумела-ж, родных самому закладчыку славянаў.* Інстытут і Музэй Рэрыха утрымлівае *Цэнтральнае таварыства імя Рэрыха ў Нью-Іорку, якое мае свае аддзелы,* ці ў запраўднасьці блізу што самастойныя Таварыствы ім. Рэрыха, *раскіданыя па ўсім сьвеце.* 4 гады таму назад гэткія таварыствы існавалі ў 26 дзяржавах Эўропы, Амэрыкі, Азіі, нават Аўстраліі — у лічбе 7 дзесяткоў. Агульная і супольная мэта ўсіх гэтых Таварыстваў, зьвязаных з імем Рэрыха, пашыраць яго *аснаўную ідэю— аб рэлігійнай сіле і важнасьці мастацкай красы ў жыцьці чалавека.* Калісьці расейскі мастак мысьлі і слова, Дастаеўскі, сказаў, што *„краса спасе сьвет."* Гэтую думку Рэрых разумее зусім рэальна, як мастак, які якраз рэальна творыць гэтую красу сьвету для нашых вочаў і нашых душаў Таварыствы Рэрыха маюць мэтай *арганізацыю асяродкаў мастацкай культуры, дый захаваньня ўсіх твораў мастацтва, якія ўспадкаваны сучаснымі народамі ад іх мінуўшчыны.*

Але пачын Рэрыха — у справе аховы памятак культуры і мастацтва на ўсім сьвеце пайшоў яшчэ далей. Па яго думцы адбыліся ў 1931 і 1932 гг. спэцыяльныя міжнародныя канфэрэнцыі — дзеля разгляду і прыняцьця апрацаванага Рэрыхам у супрацоўніцтве з найвыдатнейшымі праўнікамі Эўропы *спэцыяльнанага міжнароднага „пакту", ці дагавору, які меў-бы заданьне зрабіць ахову памятак культуры, сусьветна арганізаванай і забясьпечанай у міжнародным парадку.* На гэных канфэрэнцыях прыняты быў аднагалосна гэны „пакт," якому дадзены назоў яго ініцыятара — Рэрыха, а таксама была закладзена *Міжнародная Ліга Культуры.* Абедзьве гэтыя інстытуцыі — *і „пакт Рэрыха" і яго „Ліга Культуры" — зацьверджаны ўжо Лігай Нацыяў, дый— у цэлым радзе дзяржаў сьвету над усімі будынкамі, дзе зьмяшчаюцца творы мастацкай культуры,* як *музэі, акадэміі, галерэі абразоў, выстаўкі і т. д, — павяваецца ўжо і спэцыяльны*

„сьцяг міру,“ які ахоўвае іх, так-сама, як у часе вайны ахоўвае шпіталі ды бальніцы з раненымі — сьцяг Чырвонага крыжу...

—о—

Але і на гэтым ня спыніўся яшчэ бязупынны духоўны рост слаўнага славянскага мастака. У 1924 г. Рэрых арганізуе шырокага размаху экспэдыцыю ў Азію. Яго грандыёзны аб'езд „сьвятых месцаў“ усіх азіяцкіх найстарэйшых рэлігіяў трываў звыш 5 гадоў... Апроч нязьлічанай масы рознага роду калекцыяў для свайго музэю, Рэрых прывёз з гэнай падарожы вялізарную колькасьць абразоў, краявідаў, у галіне якіх ён зьяўляецца мастаком над мастакамі. „Сьвятая Азія“ — сваей старасьвецкай душой, незразумелым ужо для заходняга эўрапэйца духам яе рэлігіі і мастацтва, зрабіла на Рэрыха вялізарнае ўражаньне. Ён ужо ня мог адарвацца ад іх асаблівай красы, і даў яе выражэньне ў сваім новым творстве. Мастацкае творства Рэрыха, як і яго ўся творчая душа, паднялося на рубежную вышыню *рэлігійнага духу*. Мастак стаўся *„тэургам,“ які ўладнаператварае — з ласкі Божай — у красу акружаючую прыроду, „збаўляючы красой сьвет,“ а ў ім і чалавечую душу ад усялякага страху і жаху перад цёмнымі сіламі жыцьця.*

Але і на гэтым яшчэ не канец таму, што зрабіў Рэрых. Заехаўшы у Індыю, ён пабачыў там Гімалаі... Гэта-ж ёсьць, як ведама, найвялікшы горны хрыбет на ўсім сьвеце, з найвышэйшымі вяршынамі... Рэрых адразу пачуў, што тут якраз родная яго духу вышыня і ўжо адарвацца ад гэных Гімалаяў ня мог... Тут, у месьце Сіккім зрабіў Рэрых сваю другую пасьля Нью-Ёрку сталую сядзібу. Згэтуль большая палавіна яго нявычарпанай энэргіі аддаецца ім на гэтую яго „трэцюю бацькаўшчыну,“ калі лічыць першай Расею, а другой Амэрыку... Тутака, у даліне Пэнджаба — Кулу, бацькаўшчыне найбольш слаўных духоўных павадыроў Індыі, закладае Рэрых у 1928 г. свой новы знамяніты Гімалайскі Інстытут і Гімалайскі Музэй імя Рэрыха, якія ўжо вырасьлі за апошнія гады ў вялізарныя навукова-дасьледчыя і мастацкія установы, з якімі ня можа раўнавацца аніводная з тых, што створаны англійцамі за часы іх блізу ўжо сталетняга панаваньня ў Індыі.

Рэрых — ня толькі мастак, арганізатар, навуковец, архэолёг, няўтомны падарожнік і т. д. *Ён яшчэ і пісьменьнік.* Кнігі Рэрыха выдаюцца адразу ў *пяцёх мовах: англійскай, расейскай, францускай, гішпанскай і японскай*, а пасьля перакладаюцца і на іншыя мовы.

Галоўная ідэя Рэрыха-пісьменьніка—тая-ж самая, як і Рэрыха-мастака. Гэта—*ідэя красы, якая павінна і можа*—паводле слоў Дастаеўскага—*адратаваць сьвет.* Краса мастацтва—ня збытак, ня роскаш багатых і сытых людзей, але—*прадмет першай патрэбы і неабходнасьці для ўсяго народу, як сьвятло, паветра, хлеб і вада...*

С.

ХРОНІКА

— Ліквідацыі. Віленскі ваявода загадам з дня 20.VIII.37 зьліквідаваў Саюз Беларускіх Вучыцялёў, а Міністэрства Унутраных Спраў у кастрычніку месяцы павядоміла ўлады Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры і Т-ва Беларускай Школы, што ўтрымлівае ў сіле пастановы Віленскага ваяводы аб ліквідацыі гэтых беларускіх культурна-асьветных арганізацыяў.

— 16-га жніўня Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні выслаў Ураду Польшчы мэморыял у справе адчыненьня з пачаткам школьнага году беларускага ліцэю ў Вільні. Нажаль, гэткага ліцэю Беларусы ня маюць да сяньняшняга дня.

— Віленскае Гарадзкое Стараства 7.IX сканфіскавала новы зборнік вершаў Міхася Машары — „З пад стрэх саламяных".

— Віленскі Акружны Суд 9-га верасьня судзіў аўтара зборніка вершаў „На этапах" Максіма Танка, і выдаўца зборніка гр. Труцьку. Абое апраўданы. — 20.X Віленскі Гарадзкі Суд меў судзіць аўтара сканфіскаванага беларускага лемантара „Zasieŭki" гр. С. Паўловіча. Расправа адложана да часу новага, канкрэтнага сфармуляваньня акту абвінавачаньня, бо дасюлешні пракуратура сфармулявала надта агульна, так, што няведама было, што канкрэтна ў лемантары колідуе з кодэксам карным.

— 2.XI адбылася ў Вільні арганізаваная часапісам „Шлях Моладзі" ўрачыстасьць у чэсьць памяці беларускага пісьменьніка і дзеяча Ядвігіна Ш., ад сьмерці якога сёлета мінула 15 год. На гіл. магілках Роса адбылося ўрачыстае адкрыцьце памятніка пісьменьніку, пасьля чаго — ў залі БНА (Завальная 1)—вечар-акадэмія.

— Забаранілі сьвяткаваць „Дзень беларускай культуры". Віленскія беларусы рыхтаваліся адсьвяткаваць 28-га лістапада 1937 г. „Дзень беларускай культуры". Праграма сьвяткаваньня ахапляла адпаведны рэфэрат, дэклямацыі вершаў і канцэртную частку— з выступленьнем ведамага саліста, тэнара Міланскай Опэры, Міхала Забэйды-Суміцкага і хору гр. Рыгора Шырмы. Віленскія дзяржаўныя ўлады адміністрацыі агульнай на гэтае сьвяткаваньне не далі дазволу, мотывуючы сваю пастанову „względami bezpieczeństwa publicznego". Арганізатары „Дня беларускай культуры" з увагі на такое становішча адміністрацыйных уладаў прасілі выдаць дазвол толькі на канцэрт, які меўся адбыцца таго-ж 28 лістапада. І гэтая просьба спаткалася з адмовай адміністр. уладаў, з тых самых матываў.

— Дзень 12-га сьнежня ў Вільні быў сапраўднай радасьцю для віленскіх беларусаў. У гэты дзень Беларускі Студэнцкі Саюз сарганізаваў у будынку віленскага ўнівэрсытэту канцэрт, з выступленьнем слаўнага сьпевака Міхала Забэйды-Суміцкага і ведамага беларускага хору гр. Р. Шырмы. Вялікая унівэрсытэцкая заля ім. Сьнядэцкіх, напоўненая народам, хвалявала ад артыстычных эмоцыяў, адначасна пазнаючы вяршыні мастацтва і песельна-музычную культуру беларускага народу. Кожны выканаы нумар праграмы сьпеваком і хорам слухачы спатыкалі гучнымі воплескамі; стварылася сытуацыя, што заля была фармальна ў палоне выканаўцаў а выканаўцы — ў палоне залі. Трэба дзівіцца фізычнай вытрымаласьці артысты Забэйды - Суміцкага — ён утомлены да крайнасьці надпраграмна выканаў на жаданьне раз'энтузыязмаванай залі яшчэ некалькі беларускіх народных песень. — З прызнаньнем падчырківаем удачныя гарманізацыі беларускіх народных песень — маладога кампазытара Аўгеня Еўца, Аладава, Чуркіна, Уладзімерскага, заслужаных для беларускага музычнага творства кампазытараў Грэчанінава і Галкоўскага. Гэты апошні на канцэрце акампан'яваў сьпеваку Забэйдзе-Суміцкаму. Згарманізаваныя перапічанымі кампазытарамі беларускія народныя

песьні, прадугледжаныя праграмай, былі выкананыя на канцэрце: Галкоўскага — Вее вецер, народная, Вясна сл. М. Васілька, Чумак, нар., Восень, Кукавала зязюлька, Купалёнка, Цераз сад вінаград, нар.; Грэчанінава — То-то то, нар.; Еўца — Там на ролі, на ральлі, нар., Бульба, нар., Уладзімерскага — У чыстым полі каліна стаіць, нар.; Чуркіна — Ты прыйдзі, сл. Я. Купалы; Аладава — Лета, сл. Янкі Купалы.— Беларуская студэнцкая моладзь, выражаючы ўдзячнасьць выканаўцам канцэрту, пад гучныя воплескі залі— схапіла на рукі і высока гойдала на эстрадзе пачародна — Міхала Забэйду-Суміцкага, пасьля гр. Р. Шырму і праф. К. Галкоўскага. Уражаньні з канцэрту — незабыўныя.

— З Беларускага Музэю ім. Ів. Луцкевіча. Сярод набытых Музэем за апошнія месяцы экспанатаў на асаблівую ўвагу заслугоўвае вялікая ікона — Хрыстос на пасадзе. Ікона намаляваная на палатне, наклееным на дошцы. Ікона намалявана праўдападобна ў XVII стагодзьдзі няведамым беларускім маляром.

Музэй набыў значную колькасьць абломкаў старых віленскіх кахляў, знойдзеных у зямлі ў ваколіцах Вострае Брамы ў Вільні.

За першыя тры кварталы 1937 году лічба адведываючых Беларускі Музэй, ня гледзячы на сыстэматычны байкот яго рознымі „пшэводнікамі", перавысіла 4,000 асоб.

— У польскім часапісе „Arkady", пасьвячаным справам мастацтва, зьмешчаны ў № 8 цікаўны артыкул віленскага кансэрватара д-ра Півоцкага п. з. „Nieznana kolekcja drzeworytów ludowych". Артыкул гаворыць аб калекцыі народных дрэварытаў у Беларускім Музэі ім. Івана Луцкевіча ў Вільні. Калекцыю гэту аўтар называе запраўдным скарбам народнага мастацтва, якога нідзе не спаткаеш. Артыкул ілюструюць восем адбітак з найцікаўнейшых дрэварытаў Беларускага Музэю.

— З Беларускага Навуковага Т-ва. Урад Бел. Навук. Т-ва паслаў 12 лістапада 1937 году на рукі прэзыдэнта места Вільні мэморыял, у якім дамагаецца, каб пры вызначэньні новых назоваў віленскіх вуліц, над чым працуе адумысная магістрацкая камісія, былі ўведзены назовы, зьвязаныя з асобамі заслужаных для нашага краю і народу дзеячоў. У мэморыяле пададзена дванаццаць імёнаў, якімі Бел. Навук. Т-ва прапануе назваць віленскія вуліцы:

1. Зофіі Гальшанскай, маткі Ягелёнаў.

2. Рыгора Цамблака, першага асобнага мітрапаліты Вялікага Княства Літоўскага, выдатнага дзеяча ў галіне ўзвышэньня духовае культуры краю.

3. Доктара Францішка Скарыны, перакладчыка Бібліі на беларускую мову і выдаўцы яе, закладчыка першае друкарні ў Вільні і наагул на Усходзе Эўропы.

4. Братоў Мамонічаў, заслужаных віленскіх друкароў канца XVI і пачатку XVII ст. ст.

5. Гэтмана Рыгора Хадкевіча, імя каторага залатымі літарамі запісана ў гісторыі краю.

6. Князя Канстанціна Астрожскага, пераможцы Масквы ў бітве пад Оршай.

7. Князя Мікалая Радзівілла Чорнага, выдатнага прадстаўніка роду Радзівіллаў, які вельмі заслужыўся нашаму краю ў часе рэфармацыі.

8. Льва Сапегі, канцлера В. Кн. Літоўскага, абаронцы правоў беларускага народу, найвыдатнейшага гаспадарственнага дзеяча ў нашым краю ў XVI ст.

9. Уніяцкага мітрапаліты Язафата Вэльяміна-Рутскага, 300-летні юбілей якога адбыўся сёлета.

10. Кастуся Каліноўскага, павадыра паўстаньня 1863 году, якога расейцы пакаралі сьмерцяй на Лукішках, гарачага беларускага патрыёты і будзіцеля нашага народу.

11. Яна Чачота, аднаго з „прамяністых", шчырага працаўніка над падняцьцем народнае культуры, беларускага пісьменьніка.

12. Францішка Багушэвіча (Мацея Бурачка), беларускага паэта, чыннага ўчасьніка студнёвага паўстаньня, які прыймаў актыўны ўдзел у культурным жыцьці Вільні ў 80—90 гадох мінулага стагодзьдзя.

Бел. Навуковае Т-ва ўжо год назад падало падобны мэморыял, дагэтуль ня споўнены, якім дамагалася

названьня аднэй з віленскіх вуліц імем д-ра Францішка Скарыны, пры чым гэтае дамаганьне было вычэрпываюча ўматывавана.

—о—

— „У пушчы Палесься" — гэта новая п'еса народнага паэта Якуба Коласа. П'еса аснавана на аповесьці „Дрыгва" гэтага-ж аўтара. Нядаўна п'еса ставілася ў Віцебскім Гарадзкім Тэатры, пры гэтым спэктакль атрымаў высокую ацэну ў савецкіх тэатральных крытыкаў. П'еса мае вялікія сцэнічныя і артыстычныя вартасьці.

— Рэпэртуар беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатру ў Менску ўзбагаціўся ў бягучым зімовым сэзоне дзьвюмя новымі п'есамі: п'есай „Салавей" З. Бядулі (напісанай паводле такога-ж назову аповесьці пісьменьніка аб сялянскіх рухах у Беларусі ў канцы XVIII ст) і п'есай „Вочная стаўка" Шніціна і бр. Тур (на тэму палітычнай барацьбы ў Савецкай Беларусі). Апрача таго беларускія савецкія пісьменьнікі рыхтуюць для пастаноўкі гэтым тэатрам новыя арыгінальныя п'есы: К. Крапіва рыхтуе п'есу „Партызаны", а А. Клімковіч — „Кацярына Жарнасек" (на тэму жыцьця з часоў прыгоньніцтва ў Беларусі).

— Для мастацка - самадзейных і калгасных драматычных гурткоў выданы сёлета зборнік аднаактовых сатырычных п'ес. У зборнік уваходзяць: „Прымакі" Купалы, „Праліčыўся" Глебава і інш. Для гэтыхжа гурткоў выданы ў перакладзе на беларускую мову: „Жаніцьба" — Гогаля, п'есы Астроўскага: — „Бяз віны вінаватыя", „Ня ўсё кату масьляніца", „Гарачае сэрца".

— Першыя канцэрты Беларускай дзяржаўнай фільгармоніі. 29 і 30 кастрычніка маладая, бо існуючая некалькі месяцаў, Беларуская дзяржаўная фільгармонія ў Менску наладзіла свае першыя канцэрты музычнай творчасьці беларускага народу, адначасна будучыя паказам посьпехаў і дасягненьняў фільгармоніі. Выконывалі праграму складовыя часткі фільгармоніі і запрошаныя артысты. Аркестр беларускіх народных інструмэнтаў выканаў з цыклю музычнай творчасьці беларускага народу творы беларускіх сав. кампазытараў А. Туранкова і Н. Аладава (Капрычыё — скамплікаваны аркестравы твор). Хор фільгармоніі (у складзе 60 чалавек) выканаў чарод беларускіх народных песень у апрацоўцы кампазытараў Любана, Туранкова, Копасава, Іванова. У канцэртах бралі апроч таго ўчасьце ведамая салістка, артыстка Менскага Тэатру опэры і балету — Ларыса Александроўская і ансамбль беларускай народнай песьні і танцу. Александроўская выканала некалькі беларускіх народных песень, а ансамбль, апроч песень, беларускія народныя танцы: „Юрачку" і „Лявоніху". — Гэтыя першыя канцэрты менскай фільгармоніі спаткаліся з добрай ацэнай. Трэба адзначыць, што ў склад фільгармоніі, апроч выменяных выканаўцаў канцэрту, уваходзіць вялікі сымфанічны аркестр.

— Дэкада музыкі. У Менску, як і ў іншых гарадох СССР, адбылася ў палавіне лістапада дэкада музыкі, з удзельцам Беларускай дзяржаўнай фільгармоніі, салістаў, артыстаў Тэатру опэры і балету, артыстаў Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатру, прадстаўнікоў 2-й усебеларускай (Сав. Беларусь) алімпіяды мастацкай самадзейнасьці і інш. Праграма складалася з творчасьці беларускіх сав. кампазытараў Аладава, Залатарова, Любана, Ціцоцкага, Сакалоўскага, Равенскага і інш., беларускіх народных мэлёдый, песень і танцаў.

— У Менску нядаўна адбылася, арганізаваная Домам народнай творчасьці, 2-я Усебеларуская (Сав. Беларусь) алімпіяда народнай мастацкай самадзейнасьці, з удзельцам каля 2000 сьпевакоў, танцораў, музыкантаў, дэкляматараў, што зьехаліся з 45 раёнаў БССР. На алімпіядзе былі паказаныя розныя віды народнага мастацтва — наўперад песьні, музыка, танцы.

Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Рэдактар-выдавец: Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш.

Фр. Аляховіч — У Капцюрох Г.П.У. Вільня 1937 г.
„ 7 літ на Соловках. Львоў 1937 г.
Tadeusz Turkowski — Materjały do dziejów literatury i oświaty na Litwie i Rusi, t. II, III, Вільня 1937.
Leokadia Małunowicz — De ara victoriae in curia romana quomodo certarum sit, Вільня 1937.
Sophie Abramowicz — Etudes sur les hymnes homeriques. Вільня 1937.
Jeronimas Cicenas: Dvaruos praistos dienos. Вільня 1937.
Ateneum Wileńskie, Rocznik XII, Вільня 1937.
Українська книга, VII—VIII, IX—X, Львоў 1937.
Богословія, кн. 2—3, т. XV, Львоў 1937.
Вістнік, кн. 6, 7, 8, 9, 10, Львоў 1937.
Рідна Мова, ч.ч. 6—12, Варшава 1937.
Назустріч, №№ 12—22, Львоў 1937.
Katolik, č.č. 10—19. Прага 1937.
Der christliche orient, кн. 3—4. Мюнхен 1937.
Sygnały, №№ 34, 35, 36.
Kuźnica, №№ 19—24.
Polityka.
Zorze jutra, № 1.
Oriens, сшыток 6.
Wiadomości Literackie № 51.

Ад Рэдакцыі:

Рэдакцыя ня мае ў сябе кніжкі першай „Калосься“ з 1936 г. (усе экзэмпляры разыйшліся), дзеля чаго ня можа яе выслаць патрабуючым. Зварачваемся да В. П. Чытачоў з просьбай: калі хто можа, хай прышле нам першую кніжку „Калосься“ з 1936 г. Узамен атрымае адзін экзэмпляр або два (калі захоча) іншай кніжкі — з тых, што выйшлі з друку, ці з тых, што выйдуць.